Орлі — 500 гадоў ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Дарыюш Аўласюк ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2678) Год LII | Беласток, 9 верасня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Ціхенькая прамоцыя беларушчыны

Выстаўку керамікі і станковай графікі сужонства Тамары і Уладзіміра Васюкоў з Мінска, якая з 12 па 29 жніўня працавала ў Лапах, без перабольшвання можна назваць самай цікавай мастацкай прапановай мінулага месяца на Падляшшы.

Іншая справа — гэта прамоцыя беларускай культуры ў свеце. Часта напамінае яна абыякавасць у чыстай форме.

На адкрыцё згаданай выстаўкі ў Лапскім доме культуры прыйшлі чатыры асобы, у тым ліку амбасадар Беларусі з дачкой, бурмістр, кіраўнік Дома культуры...

— Ці ў вас графікай цікавяцца адно найважнейшыя чыноўнікі? — пытаю Дарыюша Гумоўскага, кіраўніка анімацыі культуры ЛДК і заадно дызайнера-жывапісца.

— Праўда, на адкрыцці не было натоўпу, — кажа мой субяседнік, — аднак калі раскрунуўся „Кірмаш культур", у выставачную залу заглянула многа народу.

— А чаму няма ў вас хоць бы адной інфармацыі на польскай мове? (У беларускай інфармацыі, памешчанай на двух лістках паперы фармату А-4, бачу некалькі граматычных памылак!).

— З амбасады мы атрымалі толькі такія матэрыялы, — спадар Гумоўскі заклапочаны апошнім пытаннем. Ён сам пад вялікім уражаннем таленту сужонства Васюкоў. Адну з прац нават набыў для сваёй калекцыі...

Пра выстаўку ў Лапах рэдакцыя „Нівы" даведалася выпадкова, два тыдні пасля яе адкрыцця. (У сённяшні час арганізатары культурных мерапрыемстваў проста „забіваюцца" за прысутнасць СМІ). Адсутнасць медыйнай прамоцыі паспрабаваў тлумачыць Адам Акунеўскі, рэдактар „Gazety Łapskiej".

— Пра тое, што ў нас будзе такая выстаўка, мы даведаліся тры дні да яе адкрыцця. У нас проста не было магчымасці правесці інфармацыйную акцыю. Ёсць затое два інтэрв'ю ў нашай газеце — адно з дызайнерам Уладзімірам Васюком, другое з амбасадарам РБ у Польшчы Паўлам Латушкам.

На вокладцы аднаго з апошніх нумароў лапскага двухтыднёвіка бачым маладых танцораў у беларускіх касцюмах. Гэта калектыў „Заранка" з Нясвіжа. Яны не першы раз у Лапах. Раней выступалі на імпрэзе Лапскага рэгіянальнага таварыства з цыкла „Сустрэча з культурай народаў" (апрача беларускай, была яшчэ сустрэча з культурай Інданезіі) і захапілі мясцовую публіку.

Госці з Нясвіжа, апрача спеваў і гульняў, прывезлі з сабой беларускія смакоцці.

— Найбольшы фурор выклікаў печаны парсюк, — успамінае спадар Акунеўскі, — яго раскупілі проста ўміг. Ды нават асталася нейкая ненасытнасць, бо адзін з гасцей, паспрабаваўшы далікатэс, адразу купіў рэшту парасяці...

На месцы я даведалася, што культурныя кантакты паміж Лапскім домам культуры і Беларуссю маюць пэўную традыцыю. Першы раз грамадзяне Беларусі прыехалі ў Лапы ў 2000 годзе на Міжнародны фестываль сакральнай музыкі „Te Deum".

— Ці гэта былі прадстаўнікі польскай меншасці? — пытаю.

— Не, гэта стопрацэнтныя беларусы, — кажа Адам Акунеўскі. — І займаюць яны ў нас першае або другое месца.

Мова тут пра хор „Голас душы" з касцёла св.св. Алены і Сымона ў Мінску.

У Лапах рэалізуюць міжнародны праект „Між Нарвай і Нёманам". Іх беларускім партнёрам з'яўляецца «Polska Macierz w Grodnie». У рамках праекта быў арганізаваны ўжо фатаграфічны пленэр для аматараў і курсы малявання для дзяцей і моладзі пад лозунгам „Лета над Нарвай". Творчы плён мастакоў выдадзены асобнымі альбомамі. Паколькі амаль усе карціны і фатаграфіі расслаўляюць прынарвянскія краявіды і прыроду, выданне можа служыць у якасці сувенірнай прапановы турыстам і гасцям. На жаль, абодва выданні толькі на польскай і англійскай мовах.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Тамара і Уладзімір Васюкі — *мастакі шырокавядомыя ў Беларусі (абое родам з Гомельшчыны). Тамара Васюк, можна сказаць, стварыла ўласную школу беларускіх керамістаў. Самы прэстыжны яе цыкл — фігуркі славутых беларусаў: Рагнеды, Еўфрасінні Полацкай, Барбары Радзівіл, Радзівіла Рудага... У сваіх творах кладзе яна націск не на фізічнае падабенства, а на духоўныя якасці персанажаў, паказвае іх годнасць і высакароднасць. Уладзімір Васюк, 1947 года нараджэння, удзельнічаў у больш за 30 калектыўных і 7 персанальных выстаўках. Спачатку сфармаваўся ён як майстар плаката. У сваёй станковай графіцы імкнецца разважаць аб праблемах вечнасці, аб першазначных каштоўнасцях светаадчування. Яго выяўленчая мова ціхая, лагодная, пры гэтым велічная і ўзнёслая. Погляд яе ў далёкім мінулым і ў будучыні. Тэхніка малюнкаў алоўкам, тонкія пералівы тонаў, іх фантастычныя сутыкненні ў кантрастах. Вытокі свайго таленту мастак знаходзіць у рэлігіі, а тэмы, як сам кажа, прыходзяць у сне.*

Уладзімір Васюк мае на Беласточчыне свайго вучня — Міраслава Здрайкоўскага, які супрацоўнічае з нашай рэдакцыяй.

Дык чаму ж яны маўчаць? ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

„Былога старшыню Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча вылучылі на Нобелеўскую прэмію міру".

Гэтую інфармацыю я некалькі дзён таму прачытаў на адным з сайтаў, якія, пасля ўвядзення ў дзеянне адмыслова падрыхтаванага для інтэрнэтавых сайтаў законапраекта, наўрад ці змогуць існаваць. Ляснуцца яны так, як і амаль уся нядаўняя незалежная беларуская прэса, якая, выданне за выданнем, зачынялася адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь...

У чаканні жэстаў ☞ 5

Раіна СТЭФАНЧУК

Два дні да чарговай гадавіны выбуху II сусветнай вайны міністр унутраных спраў і адміністрацыі Владыслаў Стасяк наведаў Падляшскую часць Памежнай аховы. Перадаў ён пагранічнікам сучасныя аўтамашыны маркі „Джып Чырокі" і „Форд Коннект", прыняў таксама ўдзел у адкрыцці асяродка для чужаземцаў і арышту для асоб, якіх чакае выдварэнне з Польшчы.

МУСіА перадало памежнікам пятнаццаць „Джыпаў Чырокі" з дызельнымі рухавікамі аб'ёмам 2,8 літра і магутнасцю 163 КС, абсталяваных у пад'ёмнікі, з якіх шэсць застануцца...

Дажынкі ў Гарадку ☞ 8

Міра ЛУКША

Гмінныя дажынкі ў гэты раз праводзіліся не ў Залуках. Можа і крыўдна крыху гэтай актыўнай вёсцы, што ў гэты раз не на іхні школьны падворак з'едуцца ўлады, суседзі ды госці, каб пасвяціць плён працавітага года ды пагуляць, але, як сказалі жыхары іншых вёсак Гарадоцкай гміны, у Гарадок усім бліжэй ды больш урачыста — над штучным вадасховішчам пад Зарэчанамі...

Юбілей у Чаромсе ☞ 11

Уладзімір СІДАРУК

Дакладна невядома, калі станцыя ў Чаромсе пачала лічыцца чыгуначным вузлом. Афіцыйныя дакументы не захаваліся. Мясцовыя ўлады, на аснове аповедаў старажылаў, прынялі дату — 1907 г. Упершыню юбілей адзначаўся ў 1977 годзе. З часу першага святкавання мінула трыццаць гадоў. Многае перамянілася. Ад пульсуючай жыццём Чаромхаўскай станцыі засталіся ўспаміны ды захавалася традыцыя...

Удакладненне

У „Ніве" № 35 ад 2 верасня 2007 г. у артыкуле „Мастак Мікалай Несцярэўскі" пад цэнтральным здымкам на стар. 1 павінен быў быць змешчаны наступны подпіс: **Дырэктар Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Фёдар Красюк прэзентуе працы Мікалая Несцярэўскага.**

9 770546 196000

Дык чаму ж яны маўчаць?

„Былога старшыню Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча вылучылі на Нобелеўскую прэмію міру".

Гэтую інфармацыю я некалькі дзён таму прачытаў на адным з сайтаў, якія, пасля ўвядзення ў дзеянне адмыслова падрыхтаванага для інтэрнэтавых сайтаў законапраекта, наўрад ці змогуць існаваць. Ляснуцца яны так, як і амаль уся нядаўняя незалежная беларуская прэса, якая, выданне за выданнем, зачынялася адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь.

А ў дзяржаўных газетах і на дзяржаўным беларускім тэлебачанні інфармацыі пра новага беларускага кандыдата на Нобелеўскую прэмію міру я не знайшоў і не пачуў. Чаму? Здаецца, падзея не такая ўжо малаважная. Наадварот, знакавая падзея, як для краіны, так і для ўсяго беларускага народа. Нашага суайчынніка, а тым больш былога спікера парламента і фактычна першага кіраўніка незалежнай Рэспублікі Беларусь вылучылі на самую прэстыжную прэмію ў свеце, якой штогод у шасці намінацыях узнагароджваюцца выдатныя творцы і дзеячы з ліку мноства вартасных кандыдатаў.

Дык чаму дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі на Беларусі не стараюцца ўзахлёб апярэдзіць адны другіх, абвяшчаючы гэты факт? Гэта ж ужо не першы год прадстаўнікі Беларусі змагаюцца за самы прэстыжны на свеце прыз. Вылучаліся на Нобелеўскую прэмію і вядомы беларускі праваабаронца Алесь Бяляцкі, і знакаміты паэт Рыгор Барадулін, і прызнаны ва ўсім свеце пісьменнік Васіль Быкаў. А на экранах тэлевізараў і на старонках дзяржаўных газет — маўчанне!

А іншыя падзеі, напрыклад, шостае месца на конкурсе Еўрабачання, якое заняў беларускі спявак Дзіма Калдун, ужо ўсе вушы праззвінелі. Ледзьве не палова забаўляльнага эфіру было гэтаму прысвечана. А ці можна параўнаць гэтыя дзве падзеі: конкурс песні, дзе беларускі спявак выступаў па-англійску (пазней ён праспяваў тую песню і па-руску, але не па-нашаму, не па-беларуску), і Нобелеўская прэмія міру?

Думаю, ніхто і не будзе параўноўваць. Спевакі, нават самыя лепшыя, з цягам часу забываюцца. А лаўрэаты Нобелеўскай прэміі заўсёды, нават праз стагоддзі, будуць славіць свае нацыі.

Дык чаму ж дзяржаўныя СМІ замоўчваюць гэтую інфармацыю? Думаю, адказ ляжыць на паверхні, бо ў распаўсюдзе гэтай інфармацыі не зацікаўлена існая ўлада. А прычыны простыя. Па-першае, усе кандыдаты на Нобелеўскую прэмію, якіх я пералічыў, былі, як пакінуўшы ўжо нас неўміручы Васіль Быкаў, або ёсць зараз у апазіцыі да сённяшняй улады. Гэта і Алесь Бяляцкі, і Рыгор Барадулін, і Станіслаў Шушкевіч. Васіль Быкаў мусіў нават пакінуць Радзіму і вярнуўся толькі перад самой смерцю. Астатнія, якія засталіся і дзейнічаюць у Беларусі, неаднаразова падвяргаліся пераследам, не толькі маральным. А іх дзейнасць, як і тое, што яны былі або ёсць кандыдатамі да „Нобеля", замоўчвалася або падавалася зусім не ў тым ракурсе, у якім яе бачылі яны самі і міжнародная супольнасць, якая высока ацаніла іх мужнасць і грамадзянскую пазіцыю і вылучала на ўдзел у самым прэстыжным конкурсе свету. Па-другое, іх вылучалі за тую дзейнасць, якую, мякка кажучы, не ўхваляе сённяшняя ўлада.

Прыкладам, кандыдат да „Нобеля" гэтага года Станіслаў Шушкевіч ацэнены па наступных кірунках: за вывад тактычнай і стратэгічнай ядзернай зброі з Беларусі; за Белавежскія пагадненні; за ўнёсак у мірны раскол расійскай каланіяльнай імперыі; за ўклад у бесканфліктнае пераўтварэнне СССР у незалежныя рэспублікі; за адданасць прынцыпам міру, дэмакратыі, правоў чалавека.

Прынцыпы, здаецца, добрыя і правільныя. Але сённяшнія дзяржаўныя масмедыі маўчаць пра гэта. І ўлада маўчыць. Хоць бы слова сказалі ці згодныя яны з тымі прынцыпамі, ці не.

Ну і хай маўчаць. А мы, пажадаем нашаму земляку, каб яго імя нарэшце патрапіла ў прэстыжны спіс Нобелеўскіх лаўрэатаў, бо гэта прызнанне светам не толькі яго, але і ўсёй Беларусі.

Віктар САЗОНАЎ

Карупцыя

Стараюся не хадзіць у царкву, каб занадта не ўцягнуцца ў атэізм. Але часам, як гэта ў нашай краіне завялося гаварыць, „не кцэм, але мушэм".

Вось у першы дзень верасня зайшоў я ў беластоцкі сабор. А там, быццам на маскоўскай Чырвонай плошчы ў лістападаўскую гадавіну кастрычніцкай рэвалюцыі, выстраіліся сцяганосцы; не было толькі танкаў і ракетных цягачоў. Было гэта, як пазней высветліла малітва, *wojsko Chrystusa miłujące*. Святары памаліліся таксама за *władze państwowe i samorządowe*, а адзін з іх папрасіў прысутнага ў саборы беластоцкага віцэ-прэзідэнта сказаць нейкую сваю пропаведзь. У той час некаторыя вернікі сталі выходзіць з царквы; трэба спадзявацца, што яны яшчэ вернуцца, а наша *duchowieństwo Chrystusa miłujące* не будзе ім у гэтым перашкаджаць. Прэзідэнт, а быў гэта бадай пан Арлуковіч, не ўлавіў павагі сітуацыі і, падняўшыся да райскіх варот, падзякаваў адно аўдыторыі за малітву ў памяць ахвяр вайны.

Святар, які сказаў пропаведзь, асудзіў у ёй таталітарныя рэжымы. Я так стаў сабе ўяўляць, што ў таталітарны час такія ж святары маліліся за тагачасныя *władze państwowe i samorządowe*, бо ж раней, напрыклад у царскі час, прапаведвалася, што ўлада паходзіць ад Бога. Праваслаўе пры іншых нагодах ганарыцца сваёй артадаксальнай паслядоўнасцю, а тут грэшны чалавек забыў аб гэтым прынцыпе і загаварыў як тэлевізійны шоумен.

Хваліць уладу трэба, а перад нашымі тутэйшымі асабліва такую ўладу, якая рэзка наводзіць „парадак" — такую ўладу нашы любяць. Многія тутэйшыя з Беласточчыны настальгічна ўспамінаюць сталінскі час, калі не было розных кулакоў, толькі кулак на іх; у гэтым кантэксце згадка пра тутэйшых у Беларусі была б толькі *masłem maślanym*.

Некаторыя польскія наглядальнікі параўноўваюць цяперашнюю варшаўскую ўладу з мінскай. Не выпадае і мне забываць, што каля дзесяці гадоў таму пабываў я на сустрэчы Яраслава Качынскага з беластачанамі і апісаў яе на гэтых старонках, заўважаючы пра яго такі ж як і ў Лукашэнкі націск на карупцыю, які дае паспяховую пуцёўку да ўладарання. Што з таго часу сталася ў Беларусі — вядома, што станецца ў Польшчы — яшчэ невядома. Цяперашні польскі ўрад у апытаннях грамадскай прыхільнасці карыстаецца пастаяннай падтрымкай каля чвэрці выбарчага грамадства. Мяркую, што для беларускіх улад такі ж паказальнік прынамсі ўдвая большы. У краінах з укаранелай дэмакратыяй і ўладжанай эканомікай партыі з „парадкавымі" схільнасцямі маюць маргінальную падтрымку парадку двух-трох адсоткаў.

Гэтае параўнанне дазваляе крышку меркаваць пра месца Польшчы ў часе і прасторы. Пра гэтае месца можна таксама меркаваць па сур'ёзнасці ўспрымання заходнееўрапейскай думкай некаторых паводзін нашых — абодвух — урадаў. Ды і можна падазраваць, што нягледзячы на афіцыйную фразеалогію Фелікс Дзяржынскі з Андрэем Вышынскім маюць наследнікаў не толькі ў Мінску. А сам Сталін не меў ні грошай, ні банкаўскага рахунку — не браў іх, быў непадкупны; магчыма, што не мае іх і Лукашэнка...

Я тут можа занадта засяродзіўся на выбраных польскіх і беларускіх пытаннях, а яны ж больш універсальныя. Прарок Ісая, які жыў каля трох тысячагоддзяў да нас, пісаў пра карупцыю сваіх пабрацімаў: *Książęta twoi są uporni i towarzysze złodziei; każdy z nich miłuje dary, a jadą za nagrodą (Iz., 1, 23).* І далей: *O ludu mój! Ci, którzy cię wodzą, zwodzą cię, a drogę ścieżek twoich ukrywają (Iz., 3, 12).* Аднак настане справядлівасць, толькі не названы прозвішчы яе выканаўцаў: *Biada tym, którzy rano wstawając chodzą za pijaństwem, a trwają na nim do wieczora, aż ich wino rozpali! A cytra, i lutnia, bęben, i piszczałka, i wino bywa na biesiadach ich; ale na sprawy Pańskie nie patrzą, a na uczynki rąk jego nie oglądają się (Iz., 5, 11-12). Biada tym, którzy głęboko przed Panem ukrywają radę! których każda sprawa dzieje się w ciemności, i mówią: Któż to widzi? Kto wie o nas? (Iz., 29, 15). Gdy ustanie okrutnik, a zniszczeje naśmiewca, wykorzenieni będą wszyscy, którzy pilnowali nieprawości (Iz., 29, 20). Zaiste wiele domów spustoszeje, a wielkie i piękne domy będą bez obywatela (Iz., 5, 9).* Ці ж не пра гэта найслаўнейшая фраза нашага Кшыштафа Канановіча? Складана ў цяперашні палітычны час быць атэістам.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Як я разбудзіў дэпутата

Можа хтосьці дасца дзіву, але я ў апошні час быў поўны прызнання паліцыі і работнікам польскай чыгункі. Аднойчы пасля поўдня вяртаўся я з Варшавы ў Беласток. У цягніку тлуму не было. Якраз так склалася, што сеў я ў апошні вагон. Зараз за сталічнай заставай спрабаваў я ўздрамнуць. На хвіліну разбудзіла мяне толькі кандуктарка. Правярала білеты. Пасля я зноў акунуўся ў сон. Ізноў прачнуўся, калі яшчэ раз заглянула да мяне кандуктарка:

— Мы прапануем вам перайсці ў першы ці другі вагон. У Чыжэве на цягнік сядзе каля сотні балельшчыкаў, якія вяртаюцца з матча.

— А паліцыя таксама сядзе? — спытаўся я з турботай.

— Не ведаю, здаецца, не, — адказала мілая кандуктарка.

Мы чым хутчэй, разам з усімі пасажырамі, паслухалі яе парады.

Пераходзіўшы праз вагон першага класа, я прыкмеціў драмаўшага ў саноце падляшскага дэпутата ад Лігі польскіх сем'яў Анджэя Фэдаровіча. Асцерагаючая перад „кіболямі" кандуктарка засталася ззаду. Рашыў я тады выканаць свой грамадзянскі абавязак і сам асцерагчы перад пагрозай прадстаўніка народа ў польскім Сейме.

— Спадар дэпутат, у Чыжэве будуць сядаць на цягнік „кіболі". Кандуктары прапануюць нам перайсці на пачатак цягніка.

Заспаны дэпутат падзякаваў і стаў збірацца. Я дайшоў да першага вагона.

— Тут, мабыць, будзе найбольш бяспечна. Спераду лакаматыў, побач службовае купэ кіраўніка цягніка, — падумаў я.

Цягнік спыніўся ў Чыжэве. Амаль усе сабраныя ў першым і другім вагоне кінуліся да акон.

І здзіўленне. На чыжэўскім пероне амаль нікога.

— Можа, не паспелі даехаць? — кінуў хтосьці з майго купэ.

— А, можа, загрузілі іх у аўтобусы, — раздумваў іншы пасажыр.

Мне стала лягчэй; як кажуць, спусцілася з мяне ўсё паветра. Раптам успоміў, як папярэджваў дэпутата Фэдаровіча. І зноў мае нервы напружыліся:

— І што ж гэта ён падумае — што, можа, я з яго якія кепікі чаўпу, што, можа, гэта якая журналісцкая правакацыя, а не дай Бог — наладжаная беларусамі, звязанымі з „Нівай"?

Я заплюшчыў вочы. І хоць не змог ужо ўздрамнуць, са зведзенымі павекамі даехаў за мінут пятнаццаць да наступнай станцыі — у Шэпятова. Цягнік спыніўся, і да майго купэ дайшоў роў: — *Jagiellonia! Jagiellonia!*

Я зноў зірнуў у акно. На пероне, перад другой часткай цягніка — дзесяткі здорава падвыпіўшых „шалікоўцаў". Вакол іх і пад маім вагонам столькі ж паліцыянтаў у шлемах ды з дубінкамі, дакладна ў такіх строях, у якіх — памятаю — палохалі яны маніфестантаў на Кракаўскім прадмесці ў канцы і зараз пасля ваеннага становішча. Цяпер, аднак, на іх від я ўцешыўся. Урэшце ж я дэпутата Фэдаровіча не завёў пад дурнога хату, застануся па-за ягонымі падазрэннямі. Тым не менш я рашыў на будучыню больш у такіх сітуацыях не будзіць са сну дэпутатаў ці іншых палітыкаў. Дарэчы, можа, іх увогуле не варта будзіць, хіба што ў час на ўкідванне карты для галасавання ў выбарчыя урны.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. На наступны дзень я даведаўся, што „шалікоўцы" „Ягелоніі" вярталіся на тым цягніку што і я з матча ў Высокім Мазавецкім, дзе з мясцовай „Фрэскавітай" футбалісты выйгралі 2:1. У адной са справаздач з таго матча я прачытаў: „Апошнія дзесяць хвілін сустрэчы назіраў з трыбун трэнер „Ягелоніі" Артур Платэк, які пасля адной з супярэчлівых сітуацый не вытрымаў і грымнуў бутэлькай з вадой у мурог".

Орлі — 500 гадоў

Нядзеля, 2 верасня — самы лепшы дзень на ўсялякія святкаванні. Чарговы раз даказалі гэта арганізатары мерапрыемстваў, якія прайшлі на мінулай нядзелі ў нашым рэгіёне. І ў Орлі, і ў Гайнаўцы завяршыць у пэўным сэнсе летні сезон прыйшло мноства людзей і хаця мастацкія праграмы былі даволі падобныя (калі ідзе пра выканаўцаў, бо цяжка сказаць, што падобнымі былі арлянскі юбілей і гайнаўская „Вясельная бяседа”), то публікі не бракавала. У дапамогу арганізатарам прыйшло надвор’е. З самой раніцы свяціла сонца, прадвяшчаючы прыгожы дзень, што варажыла арганізатарскія поспехі, тым болей, што за намі хмарны канец лета. Паколькі ў Гайнаўцы магутнасць святкавання можна было лёгка пералічыць на колькасць гледачоў сабраных у гарадскім амфітэатры, то магутнасць арлянскага юбілею ціха хавалася ў святочным краявідзе. Не абазначае гэта, што бракавала людзей, было дакладна наадварот. Самае цікавае, што сэнс свята ў Орлі не ў вясёлым спяванні, а ў настальгіі заварожанай у сінагозе, якая спаглядала з-над сцэны. Не кожная мясцовасць мае гонар святкаваць 500-годдзе існавання.

Яшчэ маю ў галаве расказы пра даваенную Орлю, калі жыло тут мноства жыдоў, аднак сёння ўдзельнічаю ў фэсце беларускай культуры. Мяняецца час, гісторыя дазваляе на шмат розных падзей, але часам прыносіць няшчасці. У Орлі бывала па-рознаму, аднак гісторыя сваім багаццем схіляе нас да думкі, што гэта незвычайнае месца, таму варта адзначыць такую нагоду як 500-годдзе заснавання мясцовасці. Ведаю такіх, што ахвотна паспрачаліся б за год заснавання, аднак у Орлі лічаць, што ў 1507 годзе Еська Івановіч атрымаў прывілеі і з гэтага часу пачынаецца гісторыя.

А якая была гісторыя святкавання? Усе згодна прызнаюць, што лёгка не было. Перад усім як заўсёды забракавала арганізацыйнага часу, але каб самыя важныя рашэнні не належалі аднаму чалавеку, якім пэўна быў бы новы войт, створаны быў грамадскі камітэт для наладжання гэтага вялікага свята. Камітэт не быў абмежаваны, таму ў працах мог удзельнічаць кожны, каму блізкай была ідэя, але не ёсць тайнай, што найбольш заангажаваныя былі дзеячы Таварыства сяброў Арлянскай зямлі, свежа заснаванага, між іншым, дзеля патрэбы ладжання юбілею. Таварыства таксама адзначыла сваю прысутнасць у час мерапрыемства, падрыхтавалі латок, дзе за „колькі ўгодна” можна было паспрабаваць смачнага мяса, шмальцу з хлебам ды агурцом і, вядома, нейкага „арлянскага духа”. Прысутнічалі не толькі дзеячы гэтага таварыства, свае вырабы прэзентавалі таксама іншыя народныя майстры, але сустрэць можна было і ўстановы.

Колькі ўгодна — за колькі?

Па-за сцэнай увагу шырокай публікі прыцягнула прэзентацыя супольнай акцыі выратавальных службаў на скрыжаванні вуліц перад сінагогай. Было спраўна, але перад усім гучна! Вялікая частка ўдзельнікаў асталася насуперак усяму пры сцэне, аглядаючы мастацкую праграму. Пакуль аднак калектывы пачалі спяваць, амаль гадзіну працягваліся прэзентацыі гасцей, падзякі і віншаванні. Не дзіўна, для прыкладу, госці з сябруючага з Орляй Карэліцкага раёна ў Беларусі прывезлі з сабой не адзін падарак, а таксама правялі вельмі зручную прэзентацыю свайго раёна ды павіншавалі прытым вучняў і настаўнікаў з новым школьным годам, што было прынята вельмі цёпла. На сцэне з’явіўся таксама Владзімеж Цімашэвіч, які сам прызнаўся, што вельмі даўно публічна не выступаў. Мо варта спытацца чаму якраз паявіўся цяпер і як вядома са сваім добрым сябрам Яўгенам Чыквіным? Але гэта здаецца рытарычнае пытанне... Не менш, афіцыйная частка пачалася з чытання прывілеяў, якія пасля Дарафей Фіёнік уручыў войту Пятру Сэльвесюку. А войт — малады, таму не шкадавалі ягоных ног, кружыў між крэслам ды сцэнай, прымаючы чарговыя падаркі. Сам з задавальненнем гладзеў на ўсе падзеі, падкрэсліў гонар, з якім успрымае сітуацыю гаспадара пры такой нагодзе. З прыемнасцю распавёў мне пра цэлае святкаванне, якое спалучае нядзельны фэст з выстаўкай здымкаў пра гісторыю жыдоў і сінагогі, але і пра навуковую канферэнцыю, якая адбудзецца 23 верасня. Была гэта таксама нагода, каб войт у пару словах сказаў пра сваю кароткую працу. Аказваецца, што гэта энергічны, рашучы чалавек, які без праблемаў ганарыцца дасягненнямі. Таму я даведалася пра дарожныя працы, і пра тое, што дзякуючы актыўнасці ў іншых сферах гміна амаль не дакладае цэнных злотых да арганізацыі святкавання юбілею. Варта павіншаваць.

Войт Пятро Сэльвесюк першы справа

На сцэне аднак не было вялікіх неспадзяванак. Найбольшай напэўна былі вядучыя, менавіта Юрка Астапчук ды Багуслава Карчэўская, вядомыя зоркі калектыву „Прымакі” з Гарадка. Выступалі ў галоўным эстраднікі, як „Омэн” ці „Ас”, але таксама і фальклорныя калектывы „з суседства”. З Беларусі прыехаў калектыў „Фэст”, а іншай зоркай была Алена Руткоўская з цыганскай праграмай. Не хапіла толькі жыдоўскага акцэнту, той аднак паявіцца пры чарговых мерапрыемствах, на якія запрашаем ад імя войта і аргкамітэта.

А як да ўсяго ставяцца жыхары? Усе згодна прызнаюць, што такога святкавання зноў трэба будзе пэўна доўга чакаць, бо ў Орлі не часта ўвогуле бываюць фэсты. Таму не здзівіла колькасць гледачоў і іхняя ахвота гуляць.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Дарафей Фіёнік уручыў войту Пятру Сэльвесюку прывілеі



Привилей Еску Ивановичу
на чотыры жереби в Бельском
Во имя Боже, аминь
Мы, Жигимонт, з ласки Божее коро
польский, великий князь литовский, руск
князь прускоб, жомойтский и иных дьдичи
наменито сим нашим листом, хто на него
посмотрыт або итучы его вслышит, нынеш
и потом будучым, кому будет потреб того ве
Бил нам чолом писар воеводы троцкого
пана Миколаев Миколаевича, Еско Иванов
мелел нами привилей брата нашо

Цікавая кніга

Гэтым летам у беластоцкіх кнігарнях з'явілася перавыданне польскай даваеннай навуковай кнігі „Dzieje Puszczy Białowieskiej w Polsce przedrozbiorowej" аўтарства Ота Гедэмана.

Чытачы маюць магчымасць пазнаёміцца з далёкім мінулым вялікага ляснога масіву. Аўтар падрабязна піша аб плошчы і межах Белавежскай пушчы, аб яе колішніх адміністратарах і ўладарах, аб даўняй лясной гаспадарцы.

Да кнігі далучана карта даваеннай пушчы, якая ў 1918-1939 гадах поўнасцю належала да Польшчы.

Як вядома, Белавежская пушча падзелена на кварталы — квадраты плошчай адной квадратнай вярсты. Даўжыня вярсты 1 066 метраў. Усіх кварталаў у пушчы 924. Дзялілі пушчу з поўначы на поўдзень. На ўсход ад вёскі Баб'я Гара, што ў Нараўчанскай гміне, знаходзяцца 1 і 2 кварталы, 3 і 4 цяпер у Беларусі. Таксама ў Беларусі на самай паўднёвай украіне ва ўрочышчы *Перасек* распаложаны 923 і 924 кварталы.

Белавежская пушча складаецца з лясных урочышчаў, якіх налічылі 524. Усе яны маюць свае назвы.

Перад другой сусветнай вайной на тэрыторыі пушчы працавала 13 надлясніцтваў і Нацыянальны Белавежскі парк. Надлясніцтвы не былі вялікімі. Прыкладова, на плошчы сённяшняга надлясніцтва „Броўск" тады дзейнічалі тры надлясніцтвы: „Броўск", „Нараўка" і „Чола".

Сёння польская частка Белавежскай пушчы займае плошчу 580 квадратных кіламетраў, 46% ляснога масіву. Усходняя, беларуская частка, складае 670 км², 54% пушчы. Хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, той з ахвотай пазнаёміцца з кнігай „Dzieje Puszczy Białowieskiej" надрукаванай у Беластоку па ініцыятыве надлясніцтва „Белавежа".

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Адрамантавалі прыпынак

Гарадской пасажырскай камунікацыяй у Гайнаўцы найбольш карыстаюцца пенсіянеры. Яны і найчасцей ездзяць у бальніцу, дзе зараз знаходзяцца таксама амбулаторыі і медпункты. Каля бальніцы ёсць аўтобусны прыпынак з дашкам і лавачкамі. Дагэтуль быў ён аднак вельмі невыгодны — не было чагосьці такога як перон або падвышаны тратуар. Цяжка было ўвайсці ў аўтобус, на яго высокія ступенькі.

І вось у жніўні г.г., дзякуючы дырэктару бальніцы Рыгору Тамашуку, паклалі ружовага колеру брусчатку (полбрук) і атрымаўся адмысловы перончык. Каб тут не ставілі прыватных аўтамабіляў, пад'езд адгарадзілі ад аўтастаянкі слупкамі і дзеля лепшай бачнасці іх памалявалі ў бела-чырвоныя палосачкі.

Пажылыя пасажыры гарадской камунікацыі дзякуюць дырэктару Р. Тамашуку за паспяховае і хуткае вырашэнне іх праблемы. А прыпынак лепш служыць усім.

(мох)

Па сваёй ініцыятыве

Інтэрв'ю з Дарыюшам АЎЛАСЮКОМ — старшынёю аб'яднання „Крок наперад", якое дзейнічае ў Старым Беразове.

— Вы разам з сябрамі заснавалі грамадскае аб'яднанне і ў рамках яго сталі ладзіць спартыўныя спаборніцтвы. Як нараджалася ідэя, плён якой зараз збіраеце?

— Мы рашыліся аднавіць футбольныя спаборніцтвы, якія ладзіліся ў Старым Беразове ў мінулым. Ініцыятыва стварэння аб'яднання, патрэбнага для арганізацыі спартыўных мерапрыемстваў і збірання сродкаў на іх, выйшла ад Міхала Кубайчука, Іаланты Кузыкі і мяне. У аб'яднанні „Крок наперад" сталі дзейнічаць маладыя людзі, узростам ад 18 да 35 гадоў, якія ведаюць, што ў групе лягчэй нешта зрабіць.

— Вы сказалі пра футбольныя традыцыі ў мінулым.

— У нас раней была добрая футбольная каманда, у якой актыўна дзейнічалі, між іншым, браты Семенюкі ці Ян Мароз. На нашай спартыўнай пляцоўцы ладзіліся трэніроўкі і разыгрываліся матчы. Мы рашыліся адрадзіць гэтую традыцыю. Аб'яднанне „Крок наперад" заснавалі мы ў 2004 годзе і спачатку апасаліся, што пасля доўгага перапынку зацікаўленне маладых людзей нашай ініцыятывай можа быць малое. Аднак аказалася, што спаборніцтвы за кубак войта Гайнаўскай гміны, якія мы таксама ладзім з 2004 года, сталі карыстацца вялікім прызнаннем моладзі.

— Як Вы раздабываеце сродкі на арганізаванне мерапрыемстваў?

— Арганізаваць спаборніцтвы заўсёды дапамагала нам войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч. Мы маглі таксама разлічваць на дапамогу дырэктара Гайнаўскага дома культуры Андрэя Скепкі. Спачатку мы не думалі аб раздабыванні дадатковых сродкаў, але пазнаёміліся з людзьмі з іншых арганізацый і пабачылі, што можна выступаць за еўрасаюзныя грошы на канкрэтную дзейнасць. Спачатку Фонд падтрымкі вёскі ладзіў адукацыйныя семінары, на якіх мы вучыліся пісаць праекты і выступаць за сродкі на дзейнасць сельскіх арганізацый. Пасля мы падалі ў Еўрарэгіён „Белавежская пушча" праект правядзення спартыўных спаборніцтваў і на апошні турнір атрымалі сродкі з Польска-Амерыканскага фонду вольнасці. Хаця вельмі марудна разлічыцца з атрыманых грошай, аднак будзем надалей выступаць за фінансавую дапамогу Еўрасаюза.

— Зараз на вёсках жыве штораз менш маладых людзей, а трэба выбіраць каманды з добрымі футбалістамі.

— Мы з самага пачатку ладзім турніры футбольных шасцёрак. Гэта адкрытыя мерапрыемствы і таму прымаюць у іх удзел каманды з розных гмін. У 2005 годзе выступіла 10 каманд, а ў 2006 годзе ў дзвюх катэгорыях (ва ўзросце да 17 гадоў і старэйшыя) іграла ажно 16 дружын. Не ўсе каманды былі прымеркаваны да канкрэтных сёл і ў мінулым годзе выйгралі якраз хлопцы з пагранзаставы. Аднак мінулагоднія спаборніцтвы праходзілі з раніцы да вечара і таму ігракі моцна стаміліся.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дарыюш Аўласюк

Наш турнір арганізуем дзеля гульняў і прыемнага адпачынку ад штодзённай працы і таму ў гэтым годзе мы рашыліся абмежаваць колькасць удзельнікаў. У футбольных спаборніцтвах прымала ўдзел ужо 8 каманд, а ігракі так не стаміліся, як у мінулым годзе. Перамаглі футбалісты з Дубін, другое месца занялі хлопцы з пагранзаставы, а на трэцім месцы апынулася каманда з Гайнаўкі.

— Якіх поспехаў дабіліся ігракі з вашага сяла перад сваёй публікай?

— Нашы футбалісты не перайшлі да фінальнага этапу гульняў, у якім камандам прызначаліся месцы. Што тычыцца публікі, то паглядзець на спаборніцтвы прыйшлі перад усім моладзь і мужчыны, якія раней уваходзілі ў склад нашай славутай футбольнай каманды.

— Каманды з якіх яшчэ сёл выступаюць на вашых спаборніцтвах?

— З Трывежы, Новага Беразова, Корніна, Збуча, Кашалёў.

— Ці ладзіце таксама спаборніцтвы па іншых відах спорту?

— Зараз штораз менш маладых людзей астаецца жыць у нашых вёсках. Моладзь за адукацыяй з'язджае з сёл у гарады і многія там астаюцца на пастаяннае жыхарства. Частка з іх наведвае родную вёску па суботах і нядзелях, а іншыя яшчэ радзей. Няма ў нашых вёсках валейбольных ці баскетбольных пляцовак і цяжка было б сабраць каманды для спаборніцтваў па іншых відах спорту, якімі добра было б таксама займацца. Затое амаль у кожным сяле засталіся яшчэ футбольныя пляцоўкі.

— Кубкі для пераможцаў апошняга футбольнага турніру ўручаліся ў час вясковага фэсту, наладжанага 12 жніўня ў Старым Беразове, суарганізатарам якога было Вашае аб'яднанне. Ці ад Вас выйшла ініцыятыва, каб у роднай вёсцы наладзіць культурнае мерапрыемства?

— Фэст ладзіўся ў нашым сяле некалькі гадоў таму і мы выйшлі з прапановай наладзіць чарговае музычнае мерапрыемства. Аднак галоўным арганізатарам фэсту была войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч. Мы толькі дапамагалі гмінным уладам наладзіць мерапрыемства, якое зацікавіла аднавяскоўцаў і людзей з навакольных сёл. Хаця на фэсце пераважалі старэйшыя людзі, прыбыла таксама моладзь. Мы, дапамагаючы арганізаваць музычнае мерапрыемства, здабылі чарговы вопыт.

— Які рэпертуар быў падрыхтаваны на гэтае мерапрыемства?

— Найбольш было нашых фальклорных песень і эстраднай беларускай музыкі. Выступілі ў нас калектывы з нашай гміны — „Арэшкі" і „Капэла з Дубін". З Гайнаўскага дома культуры прыбылі „Перапёлка" і салісты. Канцэрт даў вакальна-танцавальны ансамбль „Радзімічы" з Мінска, а ў час вясковай забавы іграў калектыў „Зорка".

— Памяшканне Вашага аб'яднання знаходзіцца ў адрамантаванай вясковай святліцы.

— Нам прызначылі пакой, у якім мы можам сустракацца і размаўляць пра нашыя справы. Супрацоўніцтва паміж членамі аб'яднання складваецца добра і кожны з нас можа разлічваць на дапамогу сяброў.

— А як са сродкамі на Вашу дзейнасць?

— За еўрасаюзныя грошы з Фонду ў карысць развіцця польскай вёскі-2000 купілі мы 4 камп'ютэры, прынтэр і падключыліся да Інтэрнэту. Калі маладыя людзі не павыязджаюць са Старога Беразова, апрача спартыўных спаборніцтваў хочам таксама ладзіць культурныя мерапрыемствы.

— Калі ў вёсцы моладзь распачынае нейкую грамадскую дзейнасць, гэта можа выклікаць падазронасць з боку старэйшых людзей. Як вашу актыўнасць успрымаюць аднасяльчане?

— Большасць нашых людзей задаволеная, што моладзь нешта робіць, а не стаіць з бутэлькамі піва ў руках, як гэта бывае на вёсках. Наша сяло вялікае і таму важна, што людзі жывуць згодна і могуць дагаварыцца ў істотных справах.

— Дзякую за інтэрв'ю.

Размаўляў Аляксей МАРОЗ

У чаканні жэстаў

Выступае міністр унутраных спраў і адміністрацыі Владыслаў Стасяк

Два дні да чарговай гадавіны выбуху II сусветнай вайны міністр унутраных спраў і адміністрацыі Владыслаў Стасяк наведаў Падляшскую часць Памежнай аховы. Перадаў ён пагранічнікам сучасныя аўтамашыны маркі „Джып Чырокі" і „Форд Коннект", прыняў таксама ўдзел у адкрыцці асяродка для чужаземцаў і арышту для асоб, якіх чакае выдварэнне з Польшчы.

МУСіА перадало памежнікам пятнаццаць „Джыпаў Чырокі" з дызельнымі рухавікамі аб'ёмам 2,8 літра і магутнасцю 163 КС, абсталяваных у пад'ёмнікі, з якіх шэсць застануцца ў ПЧ ПА. Рэшта трапіць у варміска-мазурскую і марскую часці. Пагранічнікі атрымалі таксама 20 машын „Форд Коннект" (таксама шэсць з іх застануцца ў Падляшскай часці) з аб'ёмам рухавіка 1,6 л і магутнасцю 90 КС. У сваю чаргу адкрыты ў гэты дзень асяродак для чужаземцаў і арышт налічваюць агулам 163 месцы (15 у арышце). Абсталяваны ў маніторынг асяродак мае кухонную і санітарную базу, залы для рэлігійных практык, месцы на прагулкі і пляцоўку для дзіцячых гульняў.

У час урачыстай пераклічкі ў беластоцкай сядзібе ПЧ ПА яе камендант палкоўнік Марыян Пагода адзначыў:

— На асаблівае адзначэнне заслугоўвае сапраўдная тэхнічная рэвалюцыя, якую мы спазналі на чарговых этапах мадэрнізацыі. Перасядаючыся з паношаных аўтамашын і матацыклаў на сучасныя сродкі транспарту, атрымаўшы эфектыўныя сродкі сувязі, мы не толькі павысілі камфорт службы, але перш за ўсё нашу паспяховасць.

Камендант дадаў яшчэ:

— Я хачу падкрэсліць ранг прадбачанай на 2007-2009 гады мадэрнізацыйнай праграмы. У яе рамках будуць збудаваны або мадэрнізаваны восем аб'ектаў падначаленых нам асяродкаў і будынкі Падляшскай часці ПА.

Ва ўрачыстасцях, апрача ўлад горада і рэгіёна, прынялі ўдзел прадстаўнікі іншых форменных службаў, у тым ліку паліцыі і пажарнікаў. Заўважыў гэта міністр Стасяк:

— Гэта значыць, што для бяспекі Польшчы мы дзейнічаем разам.

Адзначыў ён таксама, што базу ўсіх форменных службаў на працягу наступных трох гадоў чакае — як сцвердзіў — сур'ёзная мадэрнізацыя:

— Гэта адзін з асаблівых прыярытэтаў гэтага ўрада.

У час кароткай прэс-канферэнцыі шэф МУСіА, распытваны „Нівай" пра ягонае бачанне сітуацыі на польска-беларускай мяжы пасля ўваходу Польшчы ў Шэнгенскую зону ды пра прапановы беларускага боку наконт паніжэння прапанаваных цэн на візы і стварэнне паласы ў некалькі дзесяткаў кіламетраў з пагранічнымі палёгкамі, сказаў:

— Напэўна, трэба размаўляць. Уваход у Шэнгенскую зону пацягне за сабою цэлы комплекс спраў для вырашэння. Не толькі мы самі можам брацца за канкрэтныя вырашэнні. Мы ў справе Беларусі гатовы да такіх размоў таксама з нашымі партнёрамі з ЕС. Думаю, аднак, што палёгкі ў малым памежным руху гэта пытанне будучыні. Я тут прыгадваю, што сама справа нашага ўваходу ў Шэнгенскую зону яшчэ нявырашана і адкрыта. Калі гаворка аб Беларусі, не можа быць так, што з Беларусі выдвараюцца нашы грамадзяне, а пасля беларускі бок кажа, каб мы дзеля яго здабылі ў Еўрасаюзе нейкія ласкі.

— А калі палёгкі ў польска-беларускім малым памежным руху маглі б быць уведзены? — дапытваліся мы.

— Я мяркую, што гэта варта высветліць у наступным годзе. Калі тыя прынцыпы будуць ажыццяўляцца, я не бяруся адказаць.

— А магчымае паніжэнне цэн на візы?

— Гэта таксама размовы на пазнейшы час. Аднак, добра, калі ў такога тыпу размовах хочуць удзельнічаць абодва бакі.

— Прынамсі пасольства Беларусі ў Варшаве сцвярджае, што беларускі бок хоча, а Польшча якраз — не.

— Здаецца, функцыянуем у іншай краіне. Што гэта такое, што не хочам, аб чым мы не хочам размаўляць? Гэта ў апошні час нашых грамадзян не ўпусцілі на Беларусь (гаворка тут м.інш. аб віцэ-маршалку Кшыштафе Путры і старшыні Грамадзянскай платформы Дональдзе Туску — Р.С.). Можам размаўляць аб цэнах віз, але мы хацелі б з беларускага боку ўбачыць якісьці жэст добрай волі.

— Які жэст?

— Напрыклад такі, што прадстаўнікі польскага парламента, ці хтонебудзь іншы, маглі дабрацца на паланійныя мерапрыемствы. Каб, аднак, была яснасць. Нельга чакаць, што, калі, напрыклад, спадар маршалак дабярэцца на Беларусь, дык мы адразу зробім нейкія дэкларацыі. Я прашу памятаць аб тым, што мы мусім лічыцца з нашымі еўрасаюзнымі партнёрамі і з імі гэтыя справы абмяркоўваць. Лягчэй было б нам размаўляць з еўрасаюзнымі партнёрамі ў справе Беларусі, калі б мы бачылі з яе боку жэсты добрай волі.

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

Забыты адрэзак дарогі

Павятовая дарога, якая пралягае праз Трасцянку (едучы з Беластока адыходзіць яна ўлева за царквой, а перад крамай), Бялкі і Агароднікі ў Іванкі ды далей даходзіць да шашы Заблудаў — Нарва патрабуе большай увагі дарожных улад.

Пачатак дарогі ад Трасцянкі ў Бялкі добры, пакладзены асфальт і абкошаны пабочыны. Вуліца ў вёсцы Бялкі ў некаторых месцах пашкоджаная, калдобіны такія, што можна паламаць самаход. Таксама ў некаторых месцах, калі пойдзе дождж (а сёлета яго вельмі многа), дык без гумавых ботаў не прайсці. Так бывае каля маёй сялібы, пасля дажджу цяжка мне праз вуліцу да суседа дабрацца. Далей за вёскай абочыны дарогі неабкошаны, расце пустазелле вышынёю ў метр, а на паваротах разраслася лаза, і шафёры легкавушак не бачаць сустрэчных машын. Тут можа здарыцца няшчасце, асабліва калі шафёр упершыню праязджае гэтай дарогай. Варта, каб гэтым адрэзкам дарогі пацікавілася Павятовае праўленне дарог у Гайнаўцы, каб урэшце абкасілі пабочыны дарогі і высеклі лазу.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Гайнаўка прыгажэе

Сёлета ў Гайнаўцы будзе адноўленых м.інш. дзесяць вуліц. На рамонт маставых з бюджэту горада прызначылі 1 млн. 260 тысяч злотых ды на аднаўленне вулічнага электраасвятлення — 180 тысяч злотых.

У чэрвені г.г. асфальт паклалі на вулічках Мазурскай і Скарпавай. У жніўні закончылі трэці і апошні этап пабудовы вуліцы Баторыя (яна лічыцца павятовай дарогай), на скрыжаванні вуліц Баторыя, 3 Мая і А. Зіна паставілі святлафоры.

У верасні пакладуць асфальт на вул. кс. Верабея і вул. Касідлаў (у цэнтры горада), на вул. Польнай (пасёлак Мазуры), на адрэзку вул. Складоўскай ды на вул. Канапніцкай. На вул. Польную прывезлі гравій і бардзюры. На вул. кс. Верабея пракладваюць тратуары. На асфальтаванне чакаюць вул. Канапніцкай, на якой выраўналі дарожным катком гравійку ды гравійнае палатно на адрэзку вул. Складоўскай (дадам, што гэтая вуліца мае асфальт на сваім пачатку ад вул. Арміі Краёвай).

У гэтым годзе асфальт пакладуць таксама на вуліцах Іглястай і Цыпрысавай у далёкім ад цэнтра горада пасёлку Новая Лясная.

Брудныя дашкі

На прыпынках аўтобусаў гарадской камунікацыі ў Гайнаўцы па вуліцы 3 Мая пабудавалі лёгкія, прыгожыя паветкі-дашкі. Але пра іх мала клапоцяцца. Цяпер яны брудныя, запыленыя, запэцканыя, а лавачкі „аблыселі" з фарбы.

Гайнаўскае прадпрыемства гарадской камунікацыі павінна дашкі памыць, а лавачкі нанава памаляваць.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Новы год у вучнёўскай форме!

3 верасня, Беласток. На калідоры ў „чацвёрцы” красуецца фатаграфічная выстаўка. Хто не ідзе, дзеці і бацькі, усе спыняюцца каля каляровых стэндаў. На іх паказаная гісторыя беларускага школьніцтва за апошнія 10 гадоў. Як цікава пашукаць сябе на фотаздымках, асабліва на тых старых, адразу ажывае ў памяці шмат вясёлых і добрых здарэнняў...

— Ці ў школе будзе абавязак насіць вучнёўскую форму? — пытаем у дырэктара.

— Так, мы прыдбалі два камплекты формы, — кажа Збігнеў Клімовіч, — на летні і зімовы сезон. У першым выпадку гэта майка і камізэлька, у другім пуловер. Колер формы жоўты, эмблемы школы пазначаныя зялёным колерам. І цана даступная — 50 злотых.

— А колькі трэба заплаціць за камплект кніжак? — пытаю ў матуль, якія прыйшлі разам са сваімі дачушкамі-чацвёртакласніцамі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— За адны кніжкі трэба заплаціць 200 злотых. Даходзяць яшчэ сшыткі, усякія прылады...

Побач нас праходзяць дзяўчаткі. Папрыгажэлі за лета, падраслі! І якія культурныя:

— *Добры дзень! Добры дзень!* — вітаюцца па-беларуску. У вачах яшчэ летняе сонейка.

У ПШ н-р 4 у Беластоку ўжо 65 асоб вывучае беларускую мову. У першы клас, які павядзе настаўніца Ева Мураўская, запісалася 9 асоб.

— Апрача ўрокаў будзем весці два праекты. Хочам працягваць музычныя і тэатральныя заняткі, — кажа Аліна Ваўранюк, настаўніца беларускай мовы.

Успамінаем яшчэ канікулы:

— У нашай групе ёсць нават міс!

— Цікава?

Спадарыня Аліна гаворыць пра сваю вучаніцу Яну Красоўскую. Дзяўчынка заваявала першае месца на конкурсе прыгажосці для дзяцей, найперш у Маскве, а пасля ў Будапешце...

(больш падрабязна напішам у чарговых нумарах „Зоркі”)

ЗОРКА

Успаміны з канікулаў

Кінга Смык з Беластока лічыць сябе шчаслівай дзяўчынкай. Навучальны год закончыла яна з выдатнымі ацэнкамі, да таго стала пераможцам мастацкага конкурсу „Мая краіна, створаная ў марах”. Конкурс з нагоды Дня дзіцяці арганізаваны быў 1 чэрвеня ў гарадскім парку Звярынец.

— Я намалявала возера з пляжам ды лодкамі. Возера, пляж і лодкі прадставіла я ў выглядзе адмысловых лісточкаў дрэў, што малюнку прыдало атмасферу казачнасці. Мне пашанцавала. Я заняла першае месца ў конкурсе і ва ўзнагароду атрымала горны ровар. Канікулы правяла я цудоўна. У ліпені мы з мамай і брацікам Кшысем адпачывалі на Мазурскім паазер'і, пасля тыдзень правялі мы ў аграрыстычнай кватэры ў Райгродзе, затым у курортным доміку ў Аўгустове. У жніўні падаліся мы да дзядуляў на вёску. Сустрэліся мы там з сястрычкай Евай і брацікам Давідам. Каталіся мы па наваколлі на роварах. Файна было!..

Тэкст і фота (ус)

Кінга і Кшысь на вёсцы

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК АЖЫЎЛЯЮЦЦА КВЕТКІ...

...А пачалася гэтая гісторыя ў той самы час, калі на дзень нараджэння Антося дзяўчынка з паралельнага класа Марылька, якую ён запрасіў, можна сказаць, выпадкова, падарыла яму ў гаршэчку сапраўдную жывую кветку з прыгожым назовам цыкламен. Падарунак падаўся Антосю незвычайным. Аднак яшчэ больш незвычайнай падалася хлопцу тая ўсмешка, якую таксама ад усёй душы падарыла яму дзяўчына. Увесь вечар Антось не мог адарваць вачэй ад гэтай усмешкі, ад гэтых вачэй, ад гэтай дзіўнай постаці такой мілай дзяўчыны, якую раней чамусьці нават не заўважаў... Але ўсё заканчваецца. Скончыўся і ягоны дзень нараджэння, разышліся пад вечар госці.

А на раніцу... Раніцай цыкламенчык пачаў блякнуць, вянуць ды сумаваць. Засумаваў і Антось. Таму што адчуў, вельмі адчуў, нават да горла падкаціла нешта... — яму вельмі дарагая гэтая кветка. Дарагая да таго, што... І ён пачаў яе ратаваць. Колькі кніжак ён перагартаў, колькі розных прэпаратаў-сродкаў у колбачках наперамешваў!.. Усё дарэмна. Не дапамагла і асаблівая вада з суседняга калодзежа бабці-вядзьмаркі. Не даў рады і адмысловы парнічок, сканструяваны па схеме, над складаннем якой Антось прасядзеў усю ноч. Нічога, нічога не дапамагала.

Тады схіліўся Антось над кветкай, апусціў голаў і... ціха, несуцешна, адчайна заплакаў. І ў той самы момант, калі ён заплакаў, у пакойчык зайшла Марылька — тая самая дзяўчынка з паралельнага класа. Лёгка падышла яна да акна, убачыла, што ён робіць, і толькі затоена-здзіўлена, радасна і адначасна сумна выдыхнула:

— Антосік! Я ніколі і не падумала б нават!..

— Я — таксама... — узняў на яе Антось вочы, поўныя слёз.

І Марылька... Марылька таксама заплакала.

Так стаялі яны побач, зусім блізка. За акном ужо пахла восенню, іхнія галовы краналіся, іхнія пальцы перапляталіся, а іхнія слёзкі падалі і падалі ў гаршэчак. Падалі і падалі, падалі і падалі...

Ніколі потым так горка не плакалі ні Марылька, ні Антось, як у той вечар. А што ж кветка? О, мае харошыя, яна жыве, яшчэ як жыве!.. Жыве, красуе і радуе сэрцы Марыльки і Антося. Паколькі ў тых сэрцах таксама жыве яшчэ нешта...

Ваш Дзядзечка Сід
28 жніўня 2007 г., Кобрын

Вершы Віктара Шведа

Дзе быў Валодзя ў гэтым годзе?

— Мінула зноўку лета,
Наш дарагі Валодзя.
На экскурсію дзе ты
Ездзіў у гэтым годзе?

— У свет цэлы я ўлюблёны,
Хачу табе прызнацца,
Яшчэ не праверыў плёнак,
Пачаў з усім губляцца.

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007
або Муха ціп-топ на канікулах
— 9 —

У перадапошні дзень лагера „Гардкор-2007” Ляскоўскі ўспомніў пра дамову з Нягарчуком. У час ранішняй гімнастыкі ён адпусціў усіх хлопцаў і Дароту.

— Давайце крыху пабегаем, — загадаў ён мне, Ганцы, Соні і Касі.

На добры пачатак мы беглі наўздагонкі пяць кіламетраў. Пасля цэлую гадзіну мы былі вымушаны скакаць на скакалцы.

— Дазвольце аддыхацца, — папрасіла я плаксівым голасам, — а то яшчэ кіпнем!

— Нічога вам не будзе! — сказаў Ляскоўскі. — Неўзабаве будзем бегаць басанож па калючых галінках. А пасля... пераправімся цераз дзікую багну!!!

У вачах дзяўчат паказаліся слёзы.

— Вы хочаце нас замучыць! — мы зараўлі як бабры.

— Не, я хачу вас навучыць *гардкору* і дысцыпліны! Ха-ха!

— Навошта ўсё гэта? — плакалі мы.

— Бо гэтак будуць выглядаць мае ўрокі фізкультуры ў новым навучальным годзе!

Дзяўчаты ўжо нічога не сказалі. Яны і так не думалі мяняць школу.

У час снедання Шакальскі паінфармаваў, што сёння наведаюць нас дырэктары школ. Ніхто з нас не ўсхваляваўся гэтай весткай. Генік Ляскоўскі — наадварот. „Бо што скажа Нягарчук, калі пабачыць Муху і яе сябровак у добрым настроі”?! — падумалася яму.

Пасля снедання ён зноў паклікаў нашу чацвёрку і загадаў нам зрабіць інтэрв’ю з солтысам Смальніцы.

— Я не ведаў, што ў цябе такія дурныя думкі, Ляскоўскі! — грымнуў Шакальскі. — Лепш

хай дзяўчаты падрыхтуюць абед гасцям! А мы ў гэты час пойдзем сабе адпачываць на возера.

Думка Шакальскага нам не спадабалася. Чаму нас прымушаюць гараваць у той час, калі апошнія будуць сабе раскошна плаваць і загараць? Я хутка пабегла за фотаапаратам Ільі. Мы вырашылі, што выратуе нас адно шантаж. Я паклікала дырэктара набок і паказала яму танцы з дзяўчынай на дыскатэцы.

— Адкуль у цябе гэтыя фоткі?! — шакіраваным голасам спытаў мужчына.

Шакальскі, відавочна, разгубіўся. Мы, наадварот, пайшлі ў атаку:

— Я не магу вам сказаць ні аднаго слова больш. Хоць я і ўсе мае сябры добра ведаем, чым вы займаецеся кожны вечар пасля 22 гадзіны... Хіба не хочаце, каб пра ўсё пачула спадарыня Марыета?

— Ну добра, бяжыце з усімі, — сказаў Шакальскі, — я сам падрыхтую пачастунак.

— І яшчэ адно, — дадала Ганка, — сёння вечарам маеце арганізаваць нам дыскатэку.

— Добра-добра, — згадзіўся адразу дырэктар лагера. — Маю нават з сабой музыку. Ну, бяжыце на возера!

Нягарчук і іншые дырэктары

прыехалі а палове трэцяй. Шакальскі пачаставаў іх бутэрбродамі з сырам і вадой. Пасля госці сталі распытваць пра сваіх вучняў. „Шакал” усіх хваліў, а мною, Ганкай, Соняй і Касяй — проста захапляўся! Ён настолькі баяўся сваёй жонкі, што прыдумваў пра нас дзіўныя рэчы, напрыклад, што мы дапамагаем тут старэчам прайсці праз вуліцу...

Нягарчук ледзь перанёс гэтыя пахвалы. Папраўдзе ён быў у шоку і ў думках ужо рыхтаваў Геніку Ляскоўскаму страшэнную кару.

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@wp.pl>

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Малгажата Харкевіч — Нарва

Кася Бабулевіч — Бельск-Падляшскі

Польска-беларуская крыжаванка № 36



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 32: Баравік, павук, меч, ара, луч, марка, грудзі, ножка, Рым, вол, ногі, мяч, бакас. Рэпа, гном, два, роля, кладка, мурза, авечкі, на, рок, Рыга, кампраміс.

1 верасня ў Гарадку — дажынкі

Гмінныя дажынкі ў гэты раз праводзіліся не ў Залуках. Можа і крыўдна крыху гэтай актыўнай вёсцы, што ў гэты раз не на іхні школьны падворак з'едуцца ўлады, суседзі ды госці, каб пасвяціць плён працавітага года ды пагуляць, але, як сказалі жыхары іншых вёсак Гарадоцкай гміны, у Гарадок усім бліжэй ды больш урачыста — над штучным вадасховішчам пад Зарэчанамі. Каб толькі добрае надвор'е было! Справу з надвор'ем афармілі як змаглі — у час, калі амаль па ўсёй Беласточчыне то ліў дождж, то паказвалася сонейка, у Гарадку раз лінула дзве гадзіны да свята, а пасля трымалася свежая пагода, праўда, пад хмарамі, а ў час пасвячання плёну каталіцкімі і праваслаўнымі святарамі на ўсіх пралілося праменне летняга сонца. А раней, у 10 гадзін, адправіліся падзячныя набажэнствы ў гарадоцкіх царкве і касцёле.

Старасты сёлетняга свята плёнаў — Галіна Лушчынская з Меляшкоў і Міраслаў Вільдовіч з Белявіч — найлепшыя гаспадары

Усе вёскі рыхтавалі свае вянкі. У Станцыі-Валілах солтысіха Ася Салавей з іншымі гаспадынямі ўжо ў чацвер стала плесці вянок, які перамог усе апошнія сваім багаццем і красой. А спадарства Анатоль і Марыя Парэмбскія зноў укасілі жыта на ляшкі, што стануць аздобай дажынкавай сцэны (сучасныя валікі-кулі саломы з-пад камбайна таксама там паставяць). Бо не зробіш снапа як належыць, калі не скосіш жытка касой ці сярпом, не складзеш роўна сцяблін, не перавяжаш доўгім моцным пярэвяслам. На гмінныя ўрачыстасці штогод Парэмбскія, гаспадары на 13 гектарах у Станцыі-Валілах, рыхтуюць па 80-100 снапоў для афармлення сцэны, таксама і на „Сяброўскую бяседу". А сёлета між іншым гарбузы і кабачкі там палягаюць — як яны такія агромныя параслі, як нейкія амерыканскія мутанты! — перад сцэнай, якую адмыслова аздобіла Марыя Мялешка з Гарадоцкага цэнтра культуры (яе задума і выкананне — таксама і славутыя гарадоцкія макі). Аж хочацца пабачыць. Вядома, управіўшыся, пані Марыя з сынам паедзе на луг падаіць кароў. А Анатоль Парэмбскі, якога верш выйграў літаратурны конкурс на апошняй „Сяброўскай бяседзе", зноўку падрыхтаваў твор пра радаснае свята сабранага плёну, і выступіць з ім разам у пастаноўцы літаратурнага згуртавання „Каласы", дзе тутэйшыя пісьменнікі пры падмозе сяброўак з „Расспяванага Гарадка" (якія таксама складваюць вершы!) выступяць з паэтычна-музычнай пастаноўкай.

На сцэне — на дажынках „Каласы"

Пачаў мерапрыемства „Расспяваны Гарадок" дажынкавым абрадам і сцэнкай з паншчыннага яшчэ былога. Выклікала яна жывую рэакцыю публікі дзякуючы перш за ўсё акцёрскаму таленту жанчын з непераўзыдзенага калектыву, які працуе на беларускай ніве ўжо больш за паўстагоддзя. Шыку дадалі таксама іншыя тутэйшыя калектывы — залучанскія „Калінка" і „Каліна", гарадоцкія „Хутар", „Асенні ліст" і „Прымакі", вельмі добра выступілі дзеткі з Гарадка і Генрыкова, асабліва Марлена Сяржан і Крыстыян Барысевіч. Трэці раз у Гарадку выступіў калектыў песні і танца з Завадаў з гміны Баранова Астралэнцкага павета Мазавецкага ваяводства. Іх выступленне было нагодай і прыкладам добрай рэкламы сваёй гміны. Ансамбль заснаваў быў у Завадах яшчэ да вайны чалавек з Беласточчыны, аб чым не забыўся ўдзячны кіраўнік цяперашняга гурту „Завады", ён жа і цешыўся вельмі сяброўствам і з кіраўніцтвам культуры ў Гарадоцкай гміне — таксама і гарадоцкія калектывы ахвотна запрашаюцца ў гміну-сяброўку. Гледачам падабаліся асабліва танцы і нікога не прагнаў нават змрок і холад, што цягнуўся з-над вады. Дарэчы, шмат было гасцей не толькі з навакольных вёсак, — прыехала многа сваякоў з Беластока і іншых гарадоў з дзецьмі, для якіх гэтыя дажынкі — апошняе летняе мерапрыемства перад школай. Найбольш чакаўся перш за ўсё наймалодшымі гледачамі паказ феерверкаў. А пасля — старэйшымі — народнае гулянне пад музыку гурту „Ас".

Я дзяўчына з Беларусі і такой няма нідзе! — Марыя Врублеўская і Анатоль Парэмбскі ля вогнішча — сябры „Каласоў"

— Вялікая падзяка нашым гаспадарам на гэтай зямлі за іх нялёгкі труд, — узяў сваё беларускае слова бацюшка Мікалай Астапчук. — Не належыць яна да вельмі ўраджайных. У сённяшні час сустракаемся ўжо з нямногімі сапраўднымі сялянамі, што вырошчваюць на ёй усё тое, каб пракарміць сваю сям'ю і іншых. Тым не менш зямля вырошчвае тое, што неабходнае для нашага жыцця. Падыходзьма да ўсяго таго, што расце на зямлі, з вялікай пашанай. Хай гэты плён будзе справядліва падзелены.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У вайну і з вайны

Расказ Ганны ГРЫКА з Беластока.

Мяне вызначылі да работы ў Белавежу. Мне трэба было ехаць фурманкай, бо ў нашай хаце не было хлопцаў. І я там, у Белавежы, абоі ў школе здзірала, а маім канём мужчыны ездзілі. І сабралі ўсіх каля царквы, за плотам, усіх з хат павыганялі. А там шыбеніцы стаялі, людзей вешаць. Толькі вяроўкі не было. Солтыс Шпаковіч пайшоў у школу па вяроўку, але яму людзі ў школе не далі, сказалі: каб не з нашых рук тыя пастронкі. І пайшоў солтыс у іншае месца і адтуль вяроўку прынёс. Прыгналі адзінаццаць чалавек, вычыталі дзесяць мужчын і адну кабету. Фурманкай пад'ехаў чалавек з Лешукоў, з дошкай упоперак фуры. Пад'едзе пад аднаго, каб на дошку ўстаў. І той солтыс папхне... Кабета ў бардовай сукенцы была і чырвонай хустцы, і ў чорных лодачках... І яны суткі мусілі аставацца. А на другі дзень прыгналі хлопцаў з Шарашова і загадалі ім вопратку з павешаных здзіраць. А яны смяяліся, хіба нешта ім далі... І маім канём тых трупаў у ямы вазілі... А як мы назад вярталіся, то я нашым мужчынам пад рукі ўлезла, так баялася. І яшчэ цяпер не магу ў шафу заглядаць, дзе вопратка на вешаках... І бялізны не магу на шнурках вешаць, не магу...

Вызначылі мяне на работу ў Германію. І Дуню Вершкаву вызначылі, і мы мелі разам ехаць, але я паехала першай. У Германіі адрасы свае мелі і я пасля са сваёй гаспадыняй паехала да Дуні, адведаць яе. Там толькі бабка была з гаспадыняй. Дуня, калі пабачыла нас, пачала плакаць, што дахаты хоча, а гаспадыня стала прасіць, каб я яе ўгаварыла. Мела яна вокны чысціць, і замалая была. Калі была з французамі — смяялася, а калі аставалася з гаспадыняй — плакала. Прыехаў да нас быў Ваня Семаковіч, ён у вайну шуцманам быў у Нарве. Іншыя таксама немцам служылі і яны з немцамі ўцякалі. І праз ваду трэба было ўцякаць, людзі коней за хвасты хапалі, каб плыць. А праз мост нельга было, бо мост падмінаваны быў. Многа людзей тады прапала. Я тады немцам уцякла і Дуня мяне згубіла... А Ваня Дуню спаткаў і яна пра мяне пытала. Я паехала ў Штальберг. Пасля я вярнулася дахаты, замуж выйшла, дзяцей нарадзіла. Мінула некалькі гадоў, не вярнулася Дуня, няма і Вані. Абедню за яго адправілі, бо думалі, што ў вайну загінуў. А калі ўсё абстыла, прыехаў Ваня да Семаковічаў. Ён у гасціне выпіў і здымак вымае, на якім я з Дуняй была, і пытае мяне:

— А гэтую пазнаеш?

— Адкуль ты ўзяў гэты здымак? — пытаю яго.

— А, бо... — і не меў што сказаць.

— Дай мне яго, — кажу.

— Не, не дам.

І паехаў. А нядаўна прыехаў у Галубы, яго не пазналі, але ён прызнаўся. І тут хіба яму зрыў сэрца наступіў ці што і ён памёр. І хіба гэта з-за яго Дуня прапала...

З Германіі ўцякалі ўсе, ноччу аж зямля стагнала ад тае вайны. А мы ўцякалі да рускіх. Нас яны дахаты не пусцілі, загналі ў вялікі будынак за дротам і з вартай. І дапытвалі па ночах. Прыйдзе з вінтоўкай і забірае ў падвал дапытваць. Сядзе на драўнянай лаўцы, такой як у чыгуначных пачакальнях, часам ушчыпне, і гаворыць: „Ты, к..., немцам работала". І так, і сяк. А мы ўсе маладыя, а здаецца — канец ужо будзе. І як хто выйдзе з тых допытаў, то і гаварыць нават не можа. І яшчэ „санобработка", вядуць на пляц, рускі чытае і выклікае, напрыклад, мяне: Семаковіч Анна! І трэба было яму адказаць: Сяргееўна. А мы ўсё „Ja" па-нямецку крычалі, з нерваў, бо так прывыклі. І так аж тры дні збыткі з нас рабілі.

Неяк адтуль выйшлі, галодныя. І дахаты кіруемся. Пытаем саветаў, куды гэты поезд. А куда надо? — перапытваюць. А туды і туды, — адказваем. Да мы туда едем, — гавораць. І завозяць нас у зусім іншае месца. У хваінцы поезд спыніўся, нам загадалі вылезці. Жонка аднаго вартавога кажа: „Дзяўчаты, уцякайце, бо з вас скуру знімуць!" І чуем: бах-бах! Прыйшлі і ўсё ад нас забралі. Завезлі нас у Жмерынку, пайшлі мы там на рыначак. Жабракі там без ног сядзяць або на каленях лазяць, жыццё праклінаюць. Што там рабілася!

Нам сказалі, што за граніцу не выпусцяць. То я ў Кіеў падалася, бо там татаў брат жыў. Ехала на вагоне з вугалем, брудная. У Кіеве не ведаю куды падацца. Ідзе чыгуначнік:

— Что девушка так думает? — пытае. — Помочь, может, надо?

— Я тут дзядзьку маю.

— Фамилия?

— Семаковіч.

— А дзе жыве?

— Не ведаю.

— Ідзі ў адрасны стол, там пашукаюць.

Пайшла, а там людзей-людзей! Я да адной жанчыны звяртаюся.

— Фамилия? — пытае мяне.

— Семаковіч.

— Улица?

— Не ведаю, хіба Новая...

І яна мне сказала, куды ісці. Іду, але нічога не знаходжу, вяртаюся да яе:

— І Драніца была, — кажу.

— Это не Драница, а станция Дарница.

І яна мне растлумачыла, як туды дабрацца, а трэба было пераадолець 60 кіламетраў. Я ў поезд, там людзі добрыя былі, адна жанчына мне сказала, дзе трэба вылезці. Я сышла з поезда, навокал лес. Усе людзі ідуць налева, а мне сказалі направа. Іду сцежкай, а насустрач салдат ідзе, я са страху амаль не абамлела. А ён распытаў мяне, куды мне трэба, падбадзёрыў і расказаў, у якой хаце мой дзядзька жыве, бо сам ён быў адтуль.

— Я туды не пакажуся, бо мяне заўважаць, — сказаў мне. — Але на парозе твае дзядзька з дзядзінай сядзяць. Я ўчора ў іх быў...

Я пайшла. Пазнала дзядзьку.

— Здравствуйте! — прывітала іх. І засмяялася.

— На кагось ты падобная, — адказваюць, — можа кватаравалася ў нас?

Тады давай я расказваць пра сябе...

— Так ты ж да маці падобная! — усклікнуў дзядзька.

Яны мяне прынялі, дзядзька парася задушыў, такія яны рады былі сустрэчы. І я таксама не помніла, як спаць лягла. Дзядзька ў горад паехаў, а цётка стала прасіць, каб я ў іх аставалася жыць. Адкрыла куфар, а там швейная машына і тыя падарункі, што калісь у нас дзядзьку далі. А як паказалі, у якім напрамку Беласток, то я ўсё ў тое акно глядзела. І дзядзька хацеў вярнуцца на радзіму, але яго не пусцілі, на станцыі вярнулі. А я з Кіева неяк у Валілы даехала, а адтуль мяне Мікіта з Ляўкова забраў. Іду я дахаты праз поле, разораю, каб хутчэй. А дзяўчаты ў той час з царквы вярталіся.

— Наша Гандзя! — кажа адна.

— Так падаецца, — адказала другая.

І мы ўсе ў плач!

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Уік-энд у Цялушках (2)

(працяг; пачатак у 35 н-ры)

Вёска Канюкі выглядае па-новаму. І тут восенню „вылілі" асфальт. Ужо не напамінае яна мне вёску мінулага стагоддзя з-над Байкала. Цяпер настальгічная краса яе прапала, заступіла сучаснасць і выгада. Еду памаленьку, углядаюся то ў адзін, то ў другі бок. Вуліца вузенькая, як тут аўтобус з трактарам мінаюцца, — думаю сабе? Добра, што не з возам, а то коні не вытрымалі б, „насілі б", як калісьці. Бачу новыя хаты, відаць, пабудавалі іх „турысты" — гарадскія наследнікі або зусім чужыя людзі, нат з другога канца Польшчы. Іншыя хаты адноўленыя, а між імі старэнькія, занядбаныя і пустыя. Амаль на кожным панадворку буслінае гняздо, а тут аж тры на адным панадворку! Цудоўна! Узіраюся ўвесь час угару і што бачу: над самай вуліцай у гняздзе стаіць моцна запырсканы граззю бусел, цэлы амаль чорны ад гразі, а ля стаўба мужчына чэрпае ваду з калодзежа. Я з радаснай усмешкай звяртаюся да гаспадара:

— А чаму ваш бусел такі запэцканы, не прыйшлося мне такога бачыць?

Чалавек здзіўлена глянуў на мяне ды нічога не адказаў. Што падумаў, хіба ўсе мы знаем.

Еду, на вуліцы нікагусенькі. А вось далей бачу: сядзіць на лавачцы старэнькі з палкай. Раўняюся, здароўкаюся як са знаёмым, сумна ж адной у цэлай вёсцы. І так я даехала да канца невялікай вёсачкі, а там і ўказальнік

Фота Ніны БРУЧКО

з надпісам Рыбалы. Завярнулася я і давай гнацца назад. Заўтра раніцай ізноў наведаю вёску, пагляджу ваколіцу, палюбуюся. І хаця сумна без людзей — пацешу вочы бусламі, шумлівым збожжам, рознаколернымі кветкамі... А хто ведае, мо заўтра буду мець больш шчасця і сустрэну людзей, а то і пабалакаю аб пагодзе?

Дамоў вярталася я іншай дарогай — лесам праз Сітнікава. Тут многа дамоў-дачаў, раскінутых сярод высокіх старых соснаў; адна прыгажэй другой. Навокал ціха-ціха. Відаць, яшчэ раненька, гарадскія ж людзі, а да таго маладыя, любяць даўжэй паспаць. Тут жыццё „кіпіць" вечарам: смажаніна, келіх віна з суседзямі, часам песні і гітара. Іншым разам прыемна пасядзець у цішы перад домікам, паслухаць шчебету птушак, шуму соснаў, удоваль надыхацца лясным свежым паветрам, каб хапіла на цэлы наступны тыдзень цяжкой працы ў горадзе. І мне хапіла ўражанняў за ўвесь дзень, аж да заўтра.

Сённяшні шпацыр я пачала пазней, і мне хацелася паспаць, учора вечарам засядзеліся мы пад домікам са сваячніцай Валяй за кілішкам моцнай наліўкі. Еду. У сваёй вёсцы я нікога не сустрэла, ды ў Канюках мела больш шчасця. На вуліцы жанчыны гуртаваліся ля аўтакрамы з харчовымі прадуктамі, куплялі тое-сёе. Даязджаю да канца вёсачкі, некалькі метраў уніз рака Нарва, брод. За маёй маладосці ў гэтым месцы людзі пераходзілі і праязджалі на другі бок, у Плёскі. І мне прыйшлося раз пераходзіць. Сёння ідуць і едуць акружной дарогай. Пакідаю веласіпед і паспешна спускаюся пясчанай сцежкай уніз. Гляджу вакол — у воддалі за ракой, пад лесам маё далёкае дзяцінства. Вось бачу знаёмыя сосны, там быў сенакос бацькоў і многіх плёскаўцаў. Перад вачыма ўзнікае карціна: бацькі грабуць сена, а я, 7-гадовае дзяўчо, хаджу босымі ножкамі па пясочку ў плыценькай рэчачцы Локніцы. У затоцы плаваюць прыгожыя белыя лілеі, а далей крынічка, з якой змораныя цяжкой працай людзі чэрпалі вадзічку для ахалоды. Па рэчцы пад Канюкамі плавае статак незлічоных гусей. Задумалася я, карціна кранула чулую струну майго сэрца. Так, шчаслівае маё дзяцінства было. А цяпер траву ўжо ніхто не косіць, гусі не плаваюць па рэчцы. Іншы час, іншыя людзі і іх патрэбы.

Пакідаю брод і мінулае. Еду напрамкам на Рыбалы. Усюды поле, поле. Канчаецца асфальт, далей пясок, многа пяску ды цяжка ехаць. Паварочваю назад. Па правым баку прыгожая дача-палац. Апрача доміка і „піраміды" на панадворку захоўваецца прошлае — драўляная з жэрдкаў агароджа, дзікарослыя дрэвы, узгорачкі і агарод. Усюды пуста, жыхароў не відаць. Гэта ўласнасць кагосьці з Беластока, — сказалі мне. Пэўна не прыехаў, або зачыніўся ў сваім палацы.

Мацней націскаю на педалі, сонца замоцна грэе. Па дарозе мінае мяне аўтакрама, едзе ў Цялушкі. Тут жа няма „склепу", жанчыны штораз выбягаюць на вуліцу: мо ўжо едзе? А прапусціш, дык будзеш сядзець без хлеба! Праўда, малодшыя гаспадары пякуць самі, як мае суседкі — смачны, пахучы.

Задаволеная, поўная жыццёвага аптымізму, вяртаюся ў хату. Трэба адпачыць, пакалыхацца ў гамаку, падрамаць, дзенідзе крапіву парваць. Заўтра нядзеля, цэлы дзень буду адпачываць, нат веласіпедны шпацыр пакідаю, тады буду чытаць. Сусед Мікалай з жонкай, як заўсёды, паедуць „малюхам" у аддаленую за 3 км царкву ў Пухлы, суседка Маруся — на веласіпедзе. А мы з мужам будзем адпачываць і чакаць — мо нашы дзеці і ўнучкі завітаюць нас наведаць? Падвечар трэба збірацца і вяртацца дамоў у Беласток. Ох, як не хочацца! Хутчэй вярнуцца б сюды зноў. Да пабачэння.

Ніна БРУЧКО

Напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, дзякуючы намаганням беларускіх дэмакратычных актывістаў, у першую чаргу Зянона Пазьняка, для многіх у Беларусі і за яе межамі стала вядомай праўда пра Курапаты. Гэтыя мясціны пад Мінскам з'яўляюцца сведкамі аднаго са злачынстваў камуністычнага рэжыму, які з лёгкасцю пазбаўляў жыцця сотні тысяч ні ў чым непавінных людзей. Выходзячы з таго, што ўсё таемнае становіцца яўным, няма нічога дзіўнага ў тым, што гэтае злачынства аказалася выкрытым.

Сайтаў у „сусветным павуцінні", якія распавядаюць пра рэпрэсіі ў Савецкім Саюзе, шмат. Але тых, што тычацца непасрэдна рэпрэсій у Беларусі, не так ужо і многа. Адным з іх з'яўляецца сайт, які мае аднолькавую назву з падмінскім урочышчам Курапаты.

Каб зайсці на гэты сумны, але вельмі патрэбны чалавечай памяці партал, трэба набраць на сваім камп'ютэры інтэрнэтны адрас http://www.kurapaty.org. Перад намі адкрыецца даволі неардынарнае выяўленне — крыжы, крыжы і крыжы. На фоне драўляных крыжоў, якія стаяць, як паўстаўшыя ў памяці людской загінуўшыя ад рук камуністычных катаў ахвяры, месціцца надпіс — „Курапаты. Ніколі не забудзем".

Па вялікім рахунку, сайт зроблены даволі проста. Тут няма шматлікіх рубрык, яскравых аздабленняў ці нейкіх там упрыгожанняў. Але гэта, зразумела, не перашкаджае яму выконваць сваю місію — інфармаванне людзей аб адной з трагедый мінулага стагоддзя. І не толькі інфармаваць, але і збіраць іх па дапамогу ў адраджэнні гэтай памяці. Для гэтага, як паведамляецца на сайце, у Курапатах кожную суботу Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ праводзіць талакі, падчас якіх прыводзіцца ў парадак тэрыторыя мемарыяла і ўсталёўваюцца новыя крыжы.

Выйсці на ўсе нешматлікія рубрыкі сайта месцяцца зверху. Праўда, тут нас чакае невялікае расчараванне. Нягледзячы на тое, што ўласна сайт вельмі добры, старонка „Навіны" практычна не абнаўляецца. Распрацоўшчыкам і натхняльнікам партала мусіць быць сорамна, калі ў гэтай рубрыцы вісіць толькі адна навіна, якая датуецца 31 ліпеня. Няўжо больш за месяц не адбылося нешта, што б тычылася Курапатаў і аб чым варта было б паведаміць?

Рубрыка „Артыкулы" больш поўная. Можа таму, што не патрабуе аператыўнага абнаўлення. Інфармацыйная насычанасць гэтай старонкі дазваляе чалавеку, які нават нічога не ведае пра падзеі ў Курапатах, уявіць, што менавіта адбывалася там. Гэта дапамагаюць зрабіць тэксты Зянона Пазьняка, Алеся Чахольскага і Міколы Крывальцэвіча.

На старонцы „Бібліятэка" таксама пакуль зусім нягуста — наўрад ці бібліятэкай можна называць месца, дзе захоўваецца адна кніга. Магчыма, распрацоўшчыкі сайта толькі пачалі збіраць віртуальнае кнігасховішча, але, падаецца, трэба гэта рабіць з большым імпэтам, бо кніг аб курапацкай трагедыі ўжо існуе многа.

Апошняя рубрыка, якая вартая нейкай увагі — гэта „Кантакты". Праз яе можна звязацца з распрацоўшчыкамі сайта і выказаць свае меркаванні ці задаць пытанне. Праўда, па беларускай інтэрнэт-завядзёнцы пытацца прыйдзецца ў інкогніта — імёнаў і прозвішчаў, датычных да распрацоўкі сайта, мы не знойдзем.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Жнівеньскі ўмалот

На вызначэнне лепшых беларускіх спартоўцаў жніўня найбольш паўплывалі цэнтральныя падзеі гэтага перыяду — першынство свету па лёгкай атлетыцы, што прайшло ў японскім горадзе Осака і чэмпіянаты па розных відах веславання, якія адбыліся ў Нямеччыне. На гэтых форумах асобныя прадстаўнікі Беларусі дасягнулі найвышэйшага поспеху. Таму сярод намінаваных у пяцёркі мацнейшых пераважна весляры і атлеты каралевы спорту.

1. Іван Ціхан (кіданне молата) стаў трохразовым чэмпіёнам свету па лёгкай атлетыцы! Да гэтага было золата ў 2003 і 2005 гадах. Падобнага ў лёгкай атлетыцы не дасягаў аніводны прадстаўнік Беларусі. Для таго, каб перамагчы ў Японіі, Ціхану спатрэбілася паказаць лепшы вынік сезона — 83 м 63 см, прычым дамогся яго Іван толькі ў апошняй шостай спробе (!).

2-3. Вадзім Махнеў і **Раман Петрушэнка** (веславанне на байдарках) сабралі камплект медалёў (золата плюс срэбра) на спаборніцтвах вышэйшага роўню, пра што было напісана ў мінулым нумары.

4. Андрэй Міхневіч (штурханне ядра) таксама не першы раз узышоў на п'едэстал топ-турніраў. На гэты раз у яго бронзавы медаль. На чарговую заваёву Міхневіча, які быў чэмпіёнам свету ў 2003 годзе, напэўна, натхніла нараджэнне сына, якога напярэдадні чэмпіянату яму падарыла жонка — вядомая штурхальніца ядра Наталля Харанека.

5. Вадзім Дзевятоўскі (кіданне молата), які меў лепшы вынік сезона, на чэмпіянаце крыўдна апынуўся па-за п'едэсталам — ад трэцяга месца яго аддзялілі толькі 3 сантыметры. Так бывае ў спорце — найбольш стабільны ў кідках Дзевятоўскі апынуўся толькі на чацвёртым месцы.

1. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) пяты раз у гісторыі стала чэмпіёнкай планеты. Нашай Кацярыне Вялікай ужо даўно няма роўных у свеце, а журналістам усё цяжэй знаходзіць захапляльныя эпітэты і параўнанні.

2-3. Юлія Бічык і **Наталля Гелах** (акадэмічнае веславанне). Бронзавыя прызёркі афінскай алімпіяды пасля значнага перапынку зусім нядаўна зноў селі ў адну лодку. І адразу такі феерычны выступ — золата першынства свету! Па ходзе дыстанцыі беларускі ішлі трэцімі, але бліскучым спуртам вырвалі запаветную перамогу.

4. Надзея Астапчук (штурханне ядра) далёка не навічок на міжнародным подыуме. На яе рахунку чэмпіёнскі тытул 2005 года, іншыя важкія прызы. Была яна і лідэрам бягучага сезона, але на галоўным турніры прапусціла наперад прадстаўніцу Новай Зеландыі — на гэты раз у Надзеі сярэбраная ўзнагарода.

5. Ілона Усовіч (бег) на дыстанцыі 400 метраў хоць і заняла толькі (слова „толькі" пры сусветнай канкурэнцыі правільней было б замяніць на ажно) сёмае месца, але прытым двойчы здолела палепшыць нацыянальны рэкорд, які належаў яе сястры Святлане.

З камандавых дасягненняў вылучым золата жаночай зборнай на планетарным чэмпіянаце па пяцібор'і (за нашых выступалі Ганна Архіпенка, Анастасія Самусевіч і Тацяна Мазуркевіч) і другое месца мужчынскай дружыны на чэмпіянаце Еўропы па мотаболе. Адзначым таксама жаночы эстафетны квартэт (Юліяна Юшчанка, Ірына Хлюстова і сёстры Усовіч), які ў бегу 4 па 400 метраў заняў 5-е месца і ўсталяваў новы рэкорд Беларусі. Але камандай месца варта назваць хіба што кагорту весляроў на байдарках і каноэ (галоўны трэнер Уладзімір Шантаровіч), якая заваявала акрамя медалёў шэсць алімпійскіх ліцэнзій.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Духоўнае і матэрыяльнае багацце

У Скарышэве пры агратурыстычнай кватэры „Рута" Міхала Фільяновіча ўжо тры гады працуе незвычайны музей „Хата", які адлюстроўвае жыццё беларусаў вёскі. Усе экспанаты ў ім сабраны на Падляшшы. Музей з'яўляецца адным з многіх агратурыстычных атракцыёнаў Скарышэва, скарбніцай духоўнага і матэрыяльнага багацця мясцовага насельніцтва.

Уваходзячы ў музей, бачым экспанаты з галіны ткацтва, жаночую і мужчынскую вопратку, ручнікі, калыску. Далей размешчаны гаспадарчыя і хатнія прылады, тары, кашы, сохі, жорны, бочкі, царскія грошы, партрэты Маркса і Леніна. За імі — выстаўка экспанатаў, звязаных з рыбалоўствам і пчалярствам (у тым ліку вулей 1927 г.). Адведзена месца і на самадзейнасць — у якасці экспанатаў сабраны тут розныя віды баянаў 1920-ых гадоў і бубны. Нашы продкі не толькі працавалі ды гулялі, але і маліліся. У музеі захоўваюцца старыя Евангеллі, Мінея 1810 г., „Супрасльскі брацкі лісток" ад 1912 года. Міхал Фільяновіч свае карані паказвае на генеалагічнай табліцы: радавод з боку бацькі выводзіць ён з 1793 г., а з боку маці — з 1814 г.

Другі паверх музея адведзены на выстаўку „Ікона, ручнік, крыж", афіцыйнае адкрыццё якой прайшло 20 жніўня гэтага года на вясковае скарышэўскае свята св.св. Прахора і Ніканора. Ікона неразрыўна звязана з ручніком, многа відаў якіх на выстаўцы сабраў стваральнік музея. Дзе моляцца, там ёсць і крыжы. На выстаўцы можна пабачыць пісаныя іконы, розныя віды крыжоў, падсвечнікі, вышываныя ручнікі, лампадкі. Вялікія іконы — справа св. прарока Ілы, а злева — Дзіцятка Гаўрыіл з лампадкай — аздабляюць уваход у рызніцу з XIX-вечным аблачэннем. У калекцыі знаходзяцца пячаткі цэркваў, нават такіх, якія ўжо не існуюць, між іншым, у Патоцы, Суражы ці Граеве. Найстарэйшая пячатка з 1842 года. На выстаўцы бачым таксама старую плашчаніцу з першай паловы XIX ст., ладан, скуфійкі і пакрыццё прастола з II паловы XVIII ст.

Міхал Фільяновіч свае экспанаты збіраў шмат гадоў, але першапачаткова не думаў адкрываць музея. Толькі ў 2004 годзе, калі арганізаваў агратурыстычную кватэру „Рута", вырашыў, не саромеючыся сваіх каранёў, паказваць гасцям духоўнае і матэрыяльнае багацце беларусаў.

Анна ПЯТРОЎСКАЯ

Юбілей чыгуначнай Чаромхі

Дакладна невядома, калі станцыя ў Чаромсе пачала лічыцца чыгуначным вузлом. Афіцыйныя дакументы не захаваліся. Мясцовыя ўлады, на аснове аповедаў старажылаў, прынялі дату — 1907 г. Упершыню юбілей адзначаўся ў 1977 годзе. З часу першага святкавання мінула трыццаць гадоў. Многае перамянілася. Ад пульсуючай жыццём Чаромхаўскай станцыі засталіся ўспаміны ды захавалася традыцыя...

Сёлета прыпадае стогадовы юбілей. Аб гэтай падзеі памятаў Незалежны саюз польскіх машыністаў. Па ініцыятыве мясцовай арганізацыі ды пры дапамозе шматлікіх спонсараў арганізавана было мерапрыемства прысвечанае гэтаму выдатнаму юбілею. А вось што сказаў старшыня чаромхаўскіх прафсаюзаў Лявон Купрыцюк.

— У пятніцу, 24 жніўня, а гадз. 13[30] у праваслаўнай царкве пачалася літургія, у якой удзельнічалі, між іншым, старшыня Наглядальнай рады Акцыянернага таварыства „Cargo" ў Варшаве Аркадыюш Алеўнік, падляшскі ваявода Багдан Юзэф Пашкоўскі, член Маршалкоўскай управы Мікалай Яноўскі, прадстаўнік Гайнаўскага староства Мікалай Тэлянтэюк і войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі. На літургіі прысутнічала шэсцьдзесят асоб з Вроцлава, якія прадстаўлялі дваццаць дзве адзінкі Федэрацыі прафсаюзных арганізацый чыгуначнікаў.

„Маланка" на сцэне

Спяваюць ромскія прыгажуні

Капітан каманды пераможных валейбалістаў з кубкам маршалка Ваяводскай управы

Публіка была зачараваная

Госці прыехалі з Вроцлава ў дачэпленым да цягніка вагон-салоне, разам з васьмю сцяганосцамі. У царкве адбылося асвячэнне сцяга, які атрымала чаромхаўская арганізацыя машыністаў.

Святкаванні працягваліся наступнага дня, у суботу, 25 жніўня. На спартыўным стадыёне „Калеяж" адбыўся футбольны турнір за кубак дырэктара Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу і войта Чаромхаўскай гміны. Спаборнічалі чатыры каманды. Перамагла і кубак дырэктара атрымала маладзёжная каманда з Чаромхі. Чарговыя месцы занялі і прызы атрымалі каманда Пагранічнай аховы, каманды „олдбойз" з Чаромхі і Беластока. У валейбольным турніры змагаліся чатыры каманды (усе з Чаромхі). Кубак маршалка Маршалкоўскай управы заваявала маладзёжная камада гімназістаў. Чарговыя месцы занялі каманда чыгуначнікаў паравознага дэпо, каманда Галёнкі ды другая гімназічная каманда. Футбольным камандам узнагароды ўручылі дырэктар Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу ў Беластоку Марк Каспяровіч і ягоны намеснік Ян Кузэвіч, а кубак маршалка і прызы валейбалістам — старшыня Рады гміны Надзея Суліма.

Пасля адбылася мастацкая частка. Першым на сцэну (на школьнай пляцоўцы) выйшла кабарэ „Widelec" з Беластока. Вядучая канцэрт дырэктар ГАК Барбара Кузуб-Самасюк адзначыла, што сёлета кабарэ адзначае дзесяцігоддзе мастацкай дзейнасці. Кабарэ весяліла чаромхаўскую публіку скетчамі на розныя тэмы — ад штодзённшчыны пачынаючы, праз карупцыю, хваравітую службу здароўя, алімпіяду, а на кур'ёзах датычных чыгуначнага транспарту канчаючы. Многа радасці шматлюднай публіцы падарыла бельская „Маланка" пад кіраўніцтвам Сяргея Лукашука. Калектыў прэзентаваў беларускія песні, хоць не пазбягаў інтэрнацыянальных акцэнтаў. Канцэрт пачаўся вядомай песняй „Звончыкі". Калектыў цягам гадзіны не сыходзіў са сцэны, адно песні мяняліся. Пасля кожнай песні не сціхалі бурныя апладысменты. Кіраўнік гурту, прад'яўляючы новы нумар, заахвочваў: „Спявайце з намі, гуляйце!" Так было пры песні „Цячэ вада ў ярок", „Zielony mosteczek" і „Hej, sokoły". Публіка спявала, а смельчакі танцавалі. Бурныя апладысменты атрымала салістка Святлана Кобус за песню „Ягада смальная", а таксама дуэт Канстанцін Селеванові і Марк Хмур за песню „Моя деревня". Вельмі спадабалася песня „Ой ты гарны Сэмэнэ" ў выкананні квартэта. А калі прыйшоў час развітання і паплыла бадзёрая мелодыя „Ой, іграйце музыкі весялей", публіка не хацела адпускаць гасцей са сцэны. Гурт вымушаны быў выканаць на біс песні „Ехаў Ясь на кані" і „Чарка на пасашок". Але і гэта не дазволіла артыстам спакойна сысці са сцэны і трэба было ім яшчэ заспяваць „Пійце госцікі". У час развітання старшыня прафсаюзнай арганізацыі Лявон Купрыцюк падзякаваў за выступленне ды ўручыў Святлане Кобус букет прыгожых кветак. За „Маланкай" выступіў цыганскі гурт з Ольштына. Гэты калектыў раней гасцяваў у Чаромсе з нагоды 55-годдзя дызельнай цягі. Сёлета гурт прыехаў у амалоджаным складзе. Гадзінны канцэрт ромаў даказаў, што варта было прыйсці не толькі для цудоўных каляровых убораў, але і для звонкіх цыганскіх песень. Канцэрт завяршыўся выступленнем гурту „Каларыт" з Жабінкі на Беларусі. Не давялося мне, на жаль, удзельнічаць у гэтай частцы імпрэзы, чаго вельмі шкадую. Святкаванні закончыліся забавай, якая працягвалася да поўначы. Да танца падыгрывалі музыканты жабінкаўскага „Каларыту".

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

СПОВЕДЗЬ СВЯДОМАГА БЕЛАРУСА

У Беларусі напачатку дзевяностых гадоў дваццатага стагоддзя прызнацца ў сімпатыях да левапалітычных плыняў было амаль раўназначным факту абвяшчэння сябе педэрастам. Крыху пазней усё тыя ж левапалітычныя плыні, якія сцвярджалі, што чалавек мае права сам выбіраць сабе якіх хоча партнёраў, паспрабавалі знішчыць слова педэраст і сталі на заходні манер называць тую з'яву нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй. І яшчэ стараліся даказаць, што гэта не адно і тое. Але тыя тлумачэнні і намаганні далі такія ж вынікі як і прапаганда банды генералаў савецкага войска ды дзяржаўных чыноўнікаў СССР пад назвай ГКЧП, што спрабавалі зрабіць путч і аднавіць атэістычны Савецкі Саюз, які зноў будзе нацыянальную свядомасць лічыць злачынствам.

І спробы левых штосьці давесці наконт права свабоднага выбару чалавекам таго, чаго ён хоча, нават калі тое не ўспрымаецца традыцыйнай маралю, таксама ў тыя часы ляснуліся. Тады, напачатку залатых і вольных дзевяностых, у маладой рэспубліцы, якая на хвалі нарастання нацыянальнай свядомасці аднавіла сваю незалежнасць, спроба хоць на крок адхіліцца ад традыцыйнасці амаль што прыраўноўвалася да здрады Радзіме. Нацыянальная свядомасць і кансерватызм — вось чым павінен быў ганарыцца чалавек, які не адмаўляўся ад надпісу беларус ці беларуска ў яшчэ не замененым на новы савецкім пашпарце.

Таму прысланы з Расіі новы святар невялічкага праваслаўнага храма, што прытуліўся ў яшчэ меншым чым тая царкоўка раённым цэнтры на Гродзеншчыне, вельмі хутка пралічыў павелічэнне царкоўнага прыхода, які да нядаўняга часу складаўся пераважна з сагнутых у тры пагібелі ад натхняючай і ўзвышаючай савецкай працы бабулек, год нараджэння якіх згубіўся яшчэ ў мінулым веку. Разлік быў просты, як два плюс два будзе дзве пары. Кансерватыўнага складу людзі не могуць абмінаць храма. І да гэтага наплыву вернікаў бацюшка пачаў рыхтавацца вельмі сур'ёзна.

Галоўная праблема айца Мікалая была ў тым, што ён не валодаў беларускай мовай. Прыхаджане кансерватыўнага складу, якіх ён у хуткасці чакаў, могуць успрыняць гэты факт як смяротны грэх ды яшчэ самі правесці страшны суд. Прынамсі так пра іх распавядала нядаўняя савецкая прапаганда. Бацюшку было ўсё адно, хто якой нацыі і народнасці. Галоўнае, каб гэтыя людзі хадзілі ў храм Рускай праваслаўнай царквы. І беларускія нацыяналісты таксама. А як паглядзяць,

што ён на мове гэтага народа ні „бэ" ні „мэ", што тады? Пачнуць крычаць, што ім свая аўтакефальная царква патрэбна. А гэтага айцец Мікалай дапусціць не мог. Ён так і казаў: „Не трэба нам аўтакефалій, лепш гарэлкі і кефалій".

Таму бацюшка налёг на падручнікі па беларускай мове. І хоць у хуткім часе сваім валагодскім акцэнтам пачаў смяшыць нават тых старых бабулек, здаецца ўсё пайшло як па масле. Новыя прыхаджане не смяяліся з акцэнту святара, наадварот, вельмі высока ацанілі яго намаганні. Стараліся дапамагаць яму і слухалі бацюшку як маму, бо пасля былога атэістычнага выхавання яшчэ не ведалі толкам, у чым яго трэба слухацца, а з чым можна не пагаджацца. Сярод такіх быў і моладзевы лідэр адраджэнскай арганізацыі Мікіта.

Часамі пагавораць Мікіта з бацюшкам і абодвум лягчэй. Хлопец усё бліжэй да веры туліцца. А бацюшка новае даведваецца пра гісторыю Беларусі, пра традыцыі, пра прычыны, з-за якіх людзі не хочуць жыць у складзе вялікай Расіі з яе таннай нафтай і газам, а гатовыя да канца біцца за куды меншую ад той Расіі, і па тэрыторыі, і па рэсурсах сваю Радзіму.

І галоўнае, што зразумеў айцец Мікалай гэта тое, што як заходзіць размова пра нешта беларускае нацыянальнае, трэба быць вельмі пільным, як мышаняці пад печкай, на якой спіць кот. Ляпнеш што-небудзь не тое, то хутка аўтакефальная царква з'явіцца. Не паспееш і вокам мігнуць. І нават бабулькі туды перабягуць.

Таму, як Мікіта прыйшоў да споведзі, айцец Мікалай адразу пастанавіў быць асцярожным, каб хлопца не ўкрыўдзіць, і каб той яго парады не палічыў за здзек над нацыяй. Тут трэба быць асцярожным як на мінным полі і дзесяць разоў падумаць як сфармуляваць фразу, каб і каварнасць канкрэтнага граху паказаць, і нацыянальных пачуццяў не закрануць. Вельмі хваляваўся Мікалай. Ды і Мікіта не менш. Прыйшоў белы, як быццам бы цэлае лета загараў у склепе. І так расхваляваліся абодва, што ад пачатку сталі кепска разумець, што адзін другому кажуць. І чым далей, тым ўсё горай.

— Ну што ў цябе, сын мой? — спытаў святар.

— Грэшны я бацюшка, — дрыжачым, нязвыклым для яго голасам пачаў Мікіта. — Не ведаю, чаму я такі слабы. Не магу ад граху адмовіцца, хоць і жадаю ўцячы ад яго ўсім сваім сэрцам!

— А ў чым жа ты грэшны?

— Ды вось і вып'ю бывае, лішку. І куру я, як сапсаваны расійскі паравоз дзевятнаццатага стагоддзя. Бацькам мала дапамагаю. У царкву рэдка хаджу. Ды і так нешта не тое. Дзяўчатаў вельмі люблю. Грашу з імі. Справа ў тым, што я нежанаты. Убачу якую і так закахаюся, як усё адно па сэрцы рыдлёўкай стукнулі! Здаецца, яна і ёсць тая адзіная. Нават калі яна і замужам. А праз нейкі час іншая падабаецца. Вось так усё ў мяне і атрымліваецца пагана.

— Ну дык ты хоць свой мужчынскі інстынкт стрымлівай, — параіў айцец Мікалай. — Не цягні іх у ложак. А дзеля гэтага, каб і самому не хацелася ў той блудніцкі ложак, ёсць сродкі. Прыкладам, трэба менш ужываць узбуджаючай ежы. Не еш шмат масла, скварак з цыбуляй, мяса таксама, асабліва свініны, яек смажаных...

— Як жа так, — перабіў яго хлопец і сказаў далей фразу, ад якой бацюшка аж збялеў. — Гэта ж нашыя нацыянальныя традыцыі!

— Давай пра гэта паразмаўляем крыху пазней, — прапанаваў айцец Мікалай.

„Пазней дык пазней, — падумаў Мікіта. — Толькі чаму ён такія парады мне дае. Як гэта сала з цыбуляй есці нельга? Усе нашы продкі так харчаваліся. Гэта і ёсць кансерватызм у ежы".

„Дзіўны хлопец, — падумаў святар. — І як мне з гэтай сітуацыі выкруціцца. Але ж не магу я апраўдаць яго грахоў. Не магу дазваляць іх рабіць. І нешта тут не тое. Блуд і распусту, тое што ён лазіць па бабах, нацыянальнай традыцыяй называе. Дзіўная нейкая нацыя!"

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

									1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11					
				12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27					
28	29	30	31	32	33	34	35	36	37	38	39	40	41	42	43	44	45	46						

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Бенджаміна Франкліна.

1. з гарою не сходзіцца = 32 _ 10 _ 4 _ 2 _;
2. мэтанакіравана сфарміраваны вобраз аб'екта, які вылучае пэўныя важнейшыя яго характарыстыкі дзеля эмацыянальна-псіхалагічнага ўздзеяння = 37 _ 12 _ 36 _ 23 _ 14 _;
3. паравоз з вагонамі = 40 _ 5 _ 6 _ 45 _ 44 _;
4. злавіў залатую рыбку = 21 _ 22 _ 20 _ 19 _ 11 _;
5. расійскі чарнаморскі курорт для зімовай алімпіяды = 34 _ 33 _ 15 _ 16 _;
6. важная фігура не толькі ў карцёжнікаў = 9 _ 8 _ 1 _;
7. башкірскі аўтанамічны цэнтр на рэчцы Белай = 13 _ 30 _ 31 _;
8. пладовая дуля = 28 _ 29 _ 42 _ 43 _;
9. месца заслоненае ад сонца = 35 _ 18 _ 17 _ 46 _;
10. вязкая маса з мукі, замешанай на вадкасці = 26 _ 39 _ 7 _ 3 _ 24 _;
11. кітайская грашовая адзінка = 25 _ 41 _ 38 _ 27 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 31 нумара

Афіны, трон, свет, Іспанія, гяур, дына, Якаў, кум, сатырык, Нарвегія, заклік.

Рашэнне: **І свіння гаспадыня калі мукі скрыня.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем: **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Міхалу Байко** з Беластока.

09.09 – 15.09

Баран (22.03. — 20.04.) Свае пачуцці будзеш трактаваць фрывольна, наладзіш шмат цікавых хоць малаважных знаёмстваў. Дзякуючы анёльскай цярплівасці, справішся з самымі цяжкімі заданнямі. Больш дбай аб сваё здароўе.

Бык (21.04. — 21.05.) Знудзяць цябе пералётныя флірты і сустрэчы на адзін раз. Захочацца пасталець. Маеш магчымасць вельмі шмат зарабіць і ні ў чым сабе не адмаўляць. Некалькі прапаноў працы, можа, трэба будзе пагадзіць дзве.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Умеласць выклікаць спрыянне людзей. Можаш шмат чаго дабіцца. Зацікавіцца табою хтосьці ўплывовы. 11.09. (маладзік Месяца і зацьменне Сонца) з-за асобы, якой ты залішне давяраеш, пасварышся з бацькамі і будзеш несправядлівы.

Рак (23.06. — 23.07.) Шмат нервовых хвілін, ды не пакажаш гэтага па сабе. Кончацца фінансавыя праблемы. Калі маеш прабелы ў адукацыі, бярыся за навуку (знакамітыя вынікі, дзякуючы амбіцыі і працавітасці).

Леў (24.07. — 23.08.) Твая прага захаплення тваёй асобай атачэння будзе задаволена. Лёгка выклічаш пачуцці новых аматараў ды падмацуеш пал старых. Шмат падлізнікаў, ды ты хутка рассакрэціш няшчырасць. Да 11.09. не падпісвай важных дамоў.

Дзева (24.08. — 23.09.) Прага ведаў і вялікія таленты дазволяць табе на відны поспех. Звернеш на сябе ўвагу настаўнікаў, выкладчыкаў, шэфа. Паставіш на самарэалізацыю, пачуцці — на далейшым плане. Не абражайся на сяброў за шчырыя словы праўды.

Шалі (24.09. — 23.10.) Пабачыш сваю палову ў зусім іншым святле. Грошай столькі, што не будзеш імі пераймацца. Адкрываюцца перад табою новыя магчымасці. Будзеш камунікатыўны і пераканальны.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Новы этап у пачуццёвых сувязях. Будзеш ведаць чаго табе трэба і пазбегнеш шматлікіх расчараванняў. Энергіі як у вулкана. Можаш страціць аб'ектыўнасць з-за свае адчайнасці. 11.09. можаш камусьці залішне паверыць.

Стралец (23.11. — 22.12.) Аформіш кожную справу, дагаворышся з людзьмі, а твой аптымізм дадасць духу іншым. З 14.09. не займайся справамі, якія цябе не датычаць.

Казярог (23.12. — 20.01.) Знакаміта складзецца ў тваіх кантактах з людзьмі, асабліва ў пачуццёвых. Узрастае твая каціроўка ў фірме, дзе будзеш цешыцца павагай і аўтарытэтам. Каханай асобе дай яшчэ адзін шанц.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 11.09. складанасці ў фінансах і на працы. Гарачыя пачуцці і жарснасць — усё цяпер перад табою. Будзь мілейшым для старых асоб, калі нават цябе ірытуюць.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Да 11.09. з поспехам кончыш кожную справу. Не чакай ад партнёра невядома чаго і ўпэўніся, ці добра разумееш ягоныя намеры. Цяжкасці змабілізуюць цябе да рашучых крокаў. 11.09. некарысны ўплыў на здароўе (не еш кансерваў і па-за домам).

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960